Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

DOI:10.17951/we.2017.3.1.13. | Wschód Europy • Восток Европы • East of Europe vol 3, 1 / 2017

Захар Шыбека
Цэнтр дыяспары Тэль-Авіўскага універсітэта, Ізраіль

Піцейны гандаль Вялікага Княства Літоўскага і ўдзел у ім габрэяў (канец XIV ст. – 1572 г.)

Уводзіны

У дадзеным артыкуле робіцца спроба рэканструяваць зараджэнне і развіццё гандлю алкагольнымі напоямі і ўдзел у ім габрэяў, бо чамусьці толькі яны абвіначваюцца ў спайванні хрысціян. У сувязі з гэтым будзе закранута праблема культуры спажывання алкаголю.

Прадметам даследавання стануць корчмы, асноўныя ўстановы, дзе прадаваліся алкагольныя напоі. Гатэльная функцыя карчомнага промыслу ў дадзеным выпадку не вывучаецца.

Даследаванне пачынаецца ад канца XIV ст., калі ў друкаваных крыніцах захаваліся звесткі пра габрэйскія корчмы, і даводзіцца да 1572 г., калі памёр архітэктар Люблінскай уніі 1569 г., вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст, а сітуацыя на алкагольным рынку паспела істотна змяніцца[1].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўзнятая праблема застаецца мала вывучанай. Існуюць невялікія працы, у якіх разглядаюцца розныя аспекты праблемы пераважна ў наукова-папулярным плане[2]. З беларускіх даследчыкаў найболь-

[1] Дакументы, якія тычыцца Валыні, улічваюцца да Люблінскай уніі, пасля якой гэты рэгіён быў далучаны да Польскага каралеўства або Кароны.

[2] *Сергачев, С. А.* Архитектура корчмы в Белоруссии // Архитектурное наследство. Вып. 33. М., 1985. С. 148–156; *Мянжынскі В.С., Несцяровіч Ю. В.* Прывілеі на корчмы з кніг Метрыкі ВКЛ 43 // Белорусский археографический ежегодник. 2003. Вып. 4. *Рогач, Л. Ф.* Яўрэй-карчмар і карчма ва ўспрыняцці грамадства XVI–XIX стст. на падсвядомым узроўні / Л. Ф. Рогач // Рэха мінуўшчыны: зб. навук. работ студ. навук. таварыства факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ імя Я. Купалы / рэдкал.: А. С. Горны, А. М. Загідулін. – Гродна: ГрГУ, 2010; *Швед, Вячаслаў.* Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) // Nowe wyzwaniagospodarki turystycznej na poziomie lokalnym, regionalnym I miedzynarodowym. – Bialystok: Oficyna Wydawnicza Politechniki Bialostockiej, 2011; *Вікол, Л. Ф.* Фарміраванне і развіццё грамадскага харчавання ў Беларусі ў XVI – пачатку XX стст. Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Мінск, 2016 (Людміла Вікол – былая Людміла

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

шы ўклад у распрацоўку гісторыі піцейнага гандлю ў межах абранага перыяду ўнесла Вольга Бабкова[3]. Пра ўжыванне алкагалю шляхты ВКЛ у XVI ст. пісала Наталля Сліж[4].

Для напісання артыкула найбольш важнымі былі непасрэдна або цесна звязаныя з абранай тэмай манаграфіі тагачасных гісторыкаў Расійскай імперыі: Сяргея Бершадскага (1850–1896) [5], Мацея Любаўскага[6], Мітрафана Доўнар-Запольскага[7], Івана Прыжова (1827–1885)[8], і гадаванца расійскай гістарычнай школы Уладзіміра Пічэты (1878–1947)[9].

У польскай гістарыяграфіі сустракаюцца даследаванні карчмаў[10]. Пэўны навукова-папулярны матэрыял пра польскія корчмы можна адшукаць у Інтэрнэце[11]. Але працы польскіх навукоўцаў мала тычыцца абранай у гэтым артыкуле праблемы ў перыяд гісторыі ВКЛ да Люблінскай уніі, калі піцейны гандаль меў сваю спецыфіку (гл. ніжэй). Перавыданне кніг польскага гісторыка М.Бабжын-

---

Рогач); *Воложанский, Владимир*. Белорусская корчма, или 5 фактов об истории придорожного сервиса. Режим доступа: http://mogu.by/news/news/belorusskaia_korchma__ili_5_faktov_ob_istorii_pridorozhnogo_servisa.html

[3] *Бабкова, Вольга.* Карчма // Наша ніва. № 32 (93) 17 лістапада 1997 г.; *Бабкова, Вольга.* Карчма (паводле актавых кніг Менскага і Слонімскага судоў канца XVI – пачатку XVII ст. // Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя. Культура. Рэлігія. Палітыка. Авантура. Героіка. Успамін / [уклад. А. Дзярновіч]. – Мінск, 2007; *Яна ж.* …І цуды і страхі: эсэ па гісторыі штодзённасці Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стагоддзяў / В. У. Бабкова. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010.

[4] *Сліж, Наталля.* Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя // ARCHE. 2012. № 3. С. 57–60.

[5] *Бершадский, С.А.* Литовские евреи: история их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии, 1388–1569 гг. СПБ, 1883.

[6] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. Издание 2–е. Москва 1915.

[7] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства літоўскага пры Ягелонах. Магістарская дысертацыя, Кіеў, 1901. Далей праца цытуецца па перавыданні: *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі ; падрыхт.: А. І. Груша, Р. А. Аляхновіч. – Мінск: Беларуская навука, 2009.

[8] *Прыжов, Иван.* История кабаков в России в связи с историей русского народа. Издание М. О. Вольфа, 1868 (перавыдадзена ў 2009 г.).

[9] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1958.

[10] *Burszta, Józef.* Wieś i karczma: rola karczmy w życiu wsi pańszczyźnianej. Warszawa: LSW, 1950; *Baronowski, B.* Polska karczma: restauracja, kawiarnia. Wrocław: Zakł. Nar. im. Ossolińskich, 1979; *Gloger, Z*. Encyklopedia staropolska ilustrowana T.3. Warszawa: Wiedza Powszechna, 1978; *Chrzanowski, T*. Karczmy i zajazdy polskie. Warszawa: Arkady, 1958.

[11] Kobyliński, Maciej. Karczmy w dawnej Polsce. Рэжым доступа: http://www.polinow.pl/karczma-karczmy_w_dawnej_polsce; Radziewicz, Joanna. Rola karczmy w życiu dawnej wsi polskiej. Рэжым доступа: http://rme.cbr.net.pl/index.php/archiwum-rme/377–marzec-kwiecie-nr-54/kultura-i-tradycje-ludowe40–7681/339–rola-karczmy-w-yciu-dawnej-wsi-polskiej

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

скага (1849–1935)[12], як і І. Прыжова, сведчыць пра запатрабаванасць у сучасным грамадстве ведаў пра гісторыю піцейнага гандлю і п'янства.

Для раскрыцця тэмы выкарыстаны разнастайныя друкаваныя крыніцы, магчымасці якіх для даследавання эканомікі ВКЛ яшчэ далёка не вычарпаны. Асноўным пісьмовым помнікам стала шматтомная Метрыка Вялікага Княства Літоўскага, якая выдавалася ў Расійскай імперыі[13], а на сучасным этапе – у Вільні і Мінску[14]. Дакументы пра корчмы ВКЛ былі выяўлены таксама ў выданнях, якія ажыццяўляліся царскім ўрадам[15], габрэйскай грамадскасцю Расіі[16] і навукоўцамі БССР[17]. Каб пазбегнуць агульных выказванняў аб піцейным гандлі ў ВКЛ, у дадзеным артыкуле ўлічваюцца гады праўлення гаспадароў дзяржавы, якія мелі важную ролю ў кантролі за гандлем алкагольнымі напоямі. У працы прысутнічаюць дзве сюжэтныя лініі: агульныя звесткі пра піцейны гандаль і ўдзел у ім габрэяў.

Экскурс у мінулае

Натуральным, адметным і спрадвечным напоем нашых продкаў быў мёд. Беларускія лясы кішэлі пчоламі. Ферментаваны водны раствор мёду, які рабіўся ў бочках, меў каля 12 градусаў мацунку. Ён лёгка выраблялся ў хатніх умовах.

---

[12] *Bobrzyński, Michał.* Prawo propinacyi w dawnej Polsce. Kraków: 1888; Далей праца цытуецца па перавыданні: *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. O prawie propinacji w dawnej Polsce. Kraków: Cztery Strony 2016. Даследаванне не ахоплівае ВКЛ, права прапінацыі якога мела асобнае заканадаўства да самых разбораў Рэчы Паспалітай (гл. сучаснае выданне аўтара, с. 83). Бабжынскі толькі двойчы ўпамянінае габрэяў.

[13] Русская историческая библиотека. Т. XX. Литовская Метрика. т. 1. Книги судных дел. СПб., 1903. Далей – РИБ. Т. XX. Литовская Метрика. Русская историческая библиотека. Т. XXVII. Литовская Метрика. Отдел 1. Часть 1: Книги записей. т. 1. СПб., 1910. Далей – РИБ. Т. XXVII. Литовская Метрика. Русская историческая библиотека. Т. XXX. Литовская метрика. Отделы первый-второй. Ч. 3: Книги публичных дел. т. 1. Юрьев, 1914. Далей – РИБ. Т. XXX. Литовская метрика.

[14] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2000–2015; Lietuvos Metrika. Vilnius, 1995–2014.

[15] Акты издаваемые виленскою комиссиею для разбора древних актов. В 39 томах. Вильня, 1865–1915. Далей – АВАК.

[16] Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т. I. Документы и регесты к истории литовских евреев (1388–1550). Собрал и издал С.А.Бершадский. СПб., 1882; Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т. II. Документы и регесты к истории литовских евреев (1550–1569). Собрал и издал С.А.Бершадский. СПб., 1882. Далей – РЕА. Регесты и надписи. Свод материалов для истории евреев в России (80 г. – 1800 г.). Т. I (до 1670 г.). СПб., 1899; Регесты и надписи. Свод материалов для истории евреев в России (80 г. – 1800 г.). Т. II. (1671–1739 г.). СПб., 1910. Далей – Рэгесты.

[17] Беларускі архіў. Том трэці (XV–XVIII). Беларуская акадэмія навук. Менск: Друкарня Беларускай Акадэміі Навук 1930 (на правах рукапісу). Далей – Беларускі архіў. Статут Великого княства Литовского 1529 г. Минск: Издательство Академии наук БССР, 1560. Далей – Статут ВКЛ 1529. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. — Мінск, 2003. Далей – Статут ВКЛ 1566.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Бортніцтвам займаліся для медаварэння, а воск, яго пабочны прадукт, ішоў на выраб свечак і на экспарт. Ячменнае піва, як і мёд, было вядома з часоў паганства. Хутчэй за ўсё гэты напой быў запазычаны ў германскіх плямёнаў і прусаў. Яно, як і піўны мёд, выраблялася ў хатніх умовах. Ячмень прарошчвалі на солад. Потым яго малолі ў жорнах. З мукі рабілася закваска (сусла), з якой і варылі піва ў катлах. Атрымліваўся нефільтраваны, мутны напой. Такое піва хутка псавалася, таму адразу ішло ў справу. Яго мацунак, як і зараз, складаў каля 5 градусаў[18].

Яшчэ ў часы паганства мёд і піва выкарыстоўваліся у рытуальных мэтах. Пасля прыняцця хрысціянства склалася традыцыя наладжвання прыхаджанамі храмаў і манахамі сходаў (братчын) або піроў.

Можна меркаваць, што на беларускіх землях продаж алкагольных напояў у корчмах пачаўся ў XI ст., калі гандляры іх засноўвалі і эксплуатавалі[19]. Відавочна, што яны абслугоўвалі жыхароў гарадоў і ўдзельнікаў транзітнага гандлю на валоках.

Паводле Устаўной граматы смаленскага князя Расціслава Мсціслававіча 1150 г., корчмы былі ў Копысі[20] (цяпер Рэспубліка Беларусь). І ўжо тады меліся саладоўні[21], а мясцовы князь рабіў спробы ўзяць гандаль алкагалем пад свой кантроль. Як толькі гарадамі авалодалі князі, карчмары пачалі плаціць падатак. У ВКЛ корчмы існавалі ў гарадах ад самага пачатку ўтварэння дзяржавы.

Папярэднікі Аляксандра Ягелончыка (да 1506)

Пры вялікім князе Вітаўце (1392–1430)

Агульны стан. Гандаль алкагольнымі напоямі (мёдам і півам) у гарадах ужо дакладна знаходзіўся пад кантролем вялікага князя і абкладваўся падаткам. І не выпадкова, бо з канца XIV ст. гарады ВКЛ станавіліся эканамічнымі цэнтрамі[22]. Заснаваць шынок мог любы гараджанін, атрымаўшы дазвол вялікага князя і заплаціўшы падатак. Можна меркаваць, што пры Вітаўце Вялікім па характары падаткаабкладання корчмы дзяліліся на прыватныя (у дакументах яны называюцца вольнымі), якія плацілі падатак у казну, і ўласна вялікакняжацкія, даход

[18] Больш падрабязна пра гісторыю напояў гл.: *Кухмістр, Верашчака (сапраўдн. Белы, Алесь).* Сакатала бочачка: праўдзівая гісторыя нашых напояў Мінск, 2017 – 208 с.: іл.

[19] *Прыжов, И.* Корчма. Исторический очерк // Русский архив. М.,1866. Вып. 7. С. 1059.

[20] *Воложанский, Владимир.* Белорусская корчма, или 5 фактов об истории придорожного сервиса. Режим доступа: http://mogu.by/news/news/belorusskaia_korchma__ili_5_faktov_ob_istorii_pridorozhnogo_servisa.html

[21] Смоленские грамоты XIII – XIV вв. Под ред. Р.И.Аванесова. Москва: АН СССР, 1963. С. 76. Саладоўня – памяшканне, дзе прарошчваюць зерне на солад. Гэта – брадзільны прадукт, падрыхтаваны з прарошчанага, высушанага і змолатага зерня збажыны, які выкарыстоўваўся для вырабу піва (ячменны солад) і гарэлкі (жытні солад) у корчмах і шынках.

[22] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 424.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

з якіх паступаў да вялікакняжацкага двара. А калі так, то ўжо ў часы Вітаўта існавала два скарбы – Земскі (агульнадзяржаўны) і Гаспадарскі[23].

Габрэі-карчмары. Як сведчыць прывілей вялікага князя 1389 г., выдадзены гарадзенскім габрэям у ходзе вайны Вітаўта з польскім кралём Ягайлам (1389–1392), ім было дазволена вырабляць і прадаваць у сваіх дамах розныя алкагольныя напоі, у тым ліку і прывазныя, з уплатай у вялікакняжацкую казну пэўнай падаці[24]. Гэта значыць, што ў Гародні ў той час існавалі габрэйскія шынкі. Так называліся гарадскія корчмы ва ўласных дамах без пастою[25]. Больш таго, ёсць звесткі, што ў вялікага князя Вітаўта габрэі былі адкупнікамі (арандатарамі) яго корчмаў[26]. Пасля смерці Вітаўта звесткі пра ўдзел габрэяў у піцейным гандлі ўдалося выявіць толькі ў часы праўлення Казіміра Ягелончыка.

Пры Казіміры Ягелончыку (1440–1492)

Агульны стан. Вядома, што ў 1471 г. у Кіеўскай зямлі з прыватных гарадскіх корчмаў збіраўся падатак[27]. Гэтым займаліся слугі ваяводы[28]. Корчмы гаспадара мясцовая адміністрацыя здавала ў арэнду. Яны знаходзіліся ў 48 гарадскіх паселішчах ВКЛ, пераважна на Валыні і Літве, а на Русі – толькі ў Менску, Віцебску, Магілёве і Смаленску[29]. У вялікакняжацкіх гарадах ВКЛ прыватныя корчмы і шынкі маглі засноўваць мяшчане, габрэі, святары з дазволу мясцовай адміністрацыі. Асобныя ж буйныя земляўласнікі атрымлівалі такое права толькі з "ласкі" гаспадара. Таму піцейныя ўстановы канцэнтраваліся пераважна ў гарадах, дзе падатак на корчмы быў самым распаўсюджаным і адным з самых старажытных[30]. У Польскім каралеўстве ў XIII ст. былі створаны па нямецкаму ўзоры не толькі гарадскія, але і сельскія гміны і амаль у кожнай з іх знаходзілася карчма[31].

Свае прыбыткі з уласных і прыватных корчмаў Казімір аддаваў на водкуп. Гэта азначала, што ён уводзіў у межах нейкай адміністрацыйнай адзінкі сваю манаполію на продаж алкагольных напояў і перадаваў яе адкупнікам. На манапольнай тэрыторыі напоі прадаваліся толькі ў вялікакняжацкіх корчмах і ў тых, якія адчыняліся з дазволу манарха. Манаполія павялічвала прыбыткі арандата-

---

[23] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 70; *Абрамчик, Лилия Я.* Становление налогов и их развитие на территории Беларуси (до января 1919 года) // Miscellanea historico-iuridica tom XI ROK 2012. С. 103.

[24] РЕА. Т. I. № 2. 1389 г. С. 26–27.

[25] РЭА. Т.2. С. 205.

[26] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 120. Аўтар не ўдакладняе якіх корчмаў – прыватных, або гаспадарскіх.

[27] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 300.

[28] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 28 (1522–1552). Кніга запісаў № 28. (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. А.А.Мянжынскі. № 106. С. 148. Далей – Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552).

[29] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 368–369.

[30] *Ён жа.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 300, 363.

[31] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. С. 19–26.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

раў і гаспадара. Мяркуючы па дакументах пазнейшага часу, манапольнае права вялікага князя на продаж алкаголю было ўстаноўлена толькі ў заходняй частцы ВКЛ. Адсутнасць шырокай сеткі сельскіх корчмаў давала палёгку гаспадарам ВКЛ у кантролі за піцейным гандлем. З мэтай падтрымкі карчомнага гандлю Казімір праводзіў палітыку пратэкцыянізму адносна вытворчасці піва. Прывоз замежнага піва забараняўся (1456 г.), таму вытворчасць піва ў ВКЛ павялічылася. Тады ж, у XV ст., у піваварэнні ВКЛ, як і ў Польскім каралеўстве, пачаў выкарыстоўвацца хмель[32]. Пазней увоз піва з-за мяжы дазваляўся, але для таго патрабаваўся вялікакняжацкі прывілей[33].

Габрэі-карчмары. Пры Казіміры габрэі бралі на водкуп піцейны збор з прыватных корчмаў[34]. У дакументах канца XV ст. (1480–я гг.) фіксуюцца выпадкі, калі на Валыні мытні разам з гаспадарскімі корчмамі перадаваліся ў арэнду кіеўскім, луцкім і трокскім габрэям[35]. Відаць, габрэйскае корчамства атрымала шырокае распаўсюджванне найперш у паўднёва-заходніх землях ВКЛ. Можна меркаваць, што габрэі Валыні прапанавалі альбо ахвотна прымалі прапанову гаспадара арандаваць корчмы супольна з мытнымі зборамі, бо мелі для таго дастаткова сродкаў і такая супольная арэнда прыносіла ім большы прыбытак на ўкладзены ў справу капітал.

Падсумаванні. Такім чынам, па асобных фрагментарных звестках можна меркаваць, што да ўступлення на прастол Аляксандра Ягелончыка карчомны гандаль ахапіў пераважна гарадскія паселішчы і мытні паўднёва-заходняй часткі ВКЛ. Тады ж узнікла адзіная форма падаткаабкладання гэтага гандлю, якая пазней атрымала назву "капшчызна" [36]. Уводзілася сістэма водкупаў на збор арэнднай платы з гаспадарскіх корчмаў і на збор капшчызны з прыватных корчмаў. Габрэі, якія пражывалі пераважна ў буйных гарадах паўднёва-заходніх ваяводстваў ВКЛ, пачыналі свой шлях у піцейны промысел з шынкарства. Відаць, ім належала ідэя водкупу піцейных збораў (гаспадарскія корчмы і капшчызны) разам з мытнямі. Ва ўсякім разе, яны выяўлялі ў гэтым зацікаўленасць.

У часы праўлення Аляксандра Ягелончыка (1492–1506)

Агульны стан

Пры вялікім князе Аляксандры з'явіліся дакументы, якія сведчаць, што для гандлю ў карчме карчмар сам вырабляў алкагольныя напоі або набываў іх ад іншых вытворцаў. На думку М. Доўнар-Запольскага, вялікі князь устанаўліваў мана-

[32] *Ён жа.* Historia karczmy. C. 23.

[33] *Ён жа.* Historia karczmy. C. 36, 62.

[34] *Фридман, Александр*. Евреи Беларуси в XV столетии: http://www.beljews.info/ru/article_15th_century.php

[35] PEA. T.1. C. 41, 45; T. 3. C. 31.

[36] Мяркуем, што ў XV ст. падатак з прыватных корчмаў пад назвай "капшчызна" існаваў у вуснай традыцыі, а ў дакументах быў зафіксаваны пазней, у пачатку XVI ст. Традыцыйна капшчызна з карчмы не перавышала адной капы. Адсюль і назва піцейнага падатка.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

полію толькі на продаж алкагольных напояў, а іх выраб заставаўся вольным[37]. Тут вядомы гісторык дапускае недакладнасць, паколькі ўсё ж такі былі абмежаванні. Афіцыйна выраб мёду і піва дазваляўся толькі на хрысціянскія і сямейныя святы, гэта значыць, толькі на свае патрэбы, а не на продаж[38]. Зразумела, што ў штодзённасці людзі выраблялі алкагольныя напоі не толькі на святы. Хатнюю вытворчасць мёду і піва, з улікам яе легкадаступнасці, узяць пад кантроль было немагчыма.

Пры Аляксандры прыватныя або вольныя корчмы ў цэнтральнай паласе ВКЛ пераважалі над гаспадарскімі. У 1494 г. у вялікакняжацкім горадзе Менску яму належала толькі частка корчмаў, якія здаваліся ў арэнду 10–ці хрысціянам. Аседлых габрэяў у горадзе ў той час яшчэ не было. Арандатары скардзіліся вялікаму князю, што, з-за мноства вольных корчмаў, яны не могуць плаціць у казну па 60 коп грошай. Таму Аляксандр пакінуў ім цану арэнды нязменнай і на наступны год, але загадаў менскаму намесніку Мікалаю Ільінічу, каб ніхто іншы корчмаў не меў[39]. Дакумент сведчыць, што ў канцы XV ст. попыт на алкагольныя напоі ў горадзе быў не такі вялікі, і гэта выклікала канкурэнцыю паміж менскімі карчмарамі на рынку спажывання. Гаспадар дзяржавы здаваў корчмы ў цэнтральнай частцы ВКЛ у арэнду асобным хрысціянам з перадачай ім манапольнага права на продаж алкагольных напояў[40]. Прыватныя корчмы забараняліся. Такім чынам, вялікі князь Аляксандр адразу ж пасля заняцця вялікакняжацкай пасады пачаў пашыраць на Міншчыну сваё манапольнае права на гандаль алкаголем.

Адхіленне габрэяў ад карчомнага гандлю і яго вынікі

На захадзе корчмы яшчэ да канца XV ст. здаваліся на водкуп асобным габрэям. Багатыя адкупнікі гародненскіх корчмаў перадавалі потым асобныя корчмы ў субарэнду сваім бедным суплямённікам[41].

У час выгнання габрэяў з ВКЛ (1495–1503) вялікі князь Аляксандр прыцягваў да карчомнага промыслу хрысціян і працягваў палітыку павялічэння прыбыткаў з корчмаў на землях Русі, якія межавалі з агрэсіўным Маскоўскім княствам. Паводле выяўленых арэндных кантрактаў хрысціянскія арандатары атрымалі шэраг ільготаў. Яны браліся пад юрысдыкцыю вялікага князя і былі падсуднымі толькі суду манарха, мелі выключнае права гандляваць алкагольнымі напоямі

[37] С. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка. С. 366; Lietuvos Metrika. Kn. 6: (1496–1506) / Užrašymų knyga 6, parengė Algirdas Baliulis, Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2007. № 394. С. 244–245. Далей – Metrika. Kn. 6: 1496–1506.

[38] Тамсама. № 411. С. 251; № 416. С. 253; № 573, 575. С. 338; № 626. С. 354.

[39] Тамсама. № 369. С. 236. Гл. таксама: Беларускі архіў. № 1. С. 1.

[40] Гл.: Рэгесты. Т. 1. С. 226; *Бершадский,С.А.* Литовские евреи. С. 276. Гл. таксама: Статут ВКЛ 1529. Разд. 3, арт. 17.

[41] История Гродненской еврейской общины в датах. Рэжым доступа: http://www.bhsinagoga.by/index.php/menu-combos/ob-obshchine/92–istoriya-grodnenskoj-evrejskoj-obshchiny-v-datakh

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ў розніцу. Прывазная гарэлка прадавалася ім оптам. Таварыствы хрысціянскіх арандатараў атрымлівалі манапольнае права на продаж алкаголю[42].

Аднак і пры наяўнасці ільготаў, у арганізацыі арэнды гаспадарскіх корчмаў узніклі цяжкасці. Мяшчане браліся за арэнду толькі ў невялікіх гарадах на ўсходзе і ў цэнтры ВКЛ (Чачэрск, Мазыр, Барысаў, Бабруйск і інш.), дзе мелася ўсяго па адной карчме, і з-за недахопу сродкаў заключалі кантракт на год-два з невялікай платай (30–40 коп грошай штогод за карчму) [43]. Аднак не ўсе вытрымлівалі нават год[44], асабліва пры арэндзе корчмаў у памежнай зоне з Маскоўскай дзяржавай, з якой у пачатку XVI ст. вялася вайна. Так, на працягу толькі аднаго 1500 года вялікі князь заключаў 5 арэндных пагадненняў на гадавую арэнду піўной і мядовай карчмы ў Крычаве: з двума мяшчанамі, з баярынам, з гаспадарскім службоўцам, з крычыўскім намеснікам і чатырмя мяшчанамі і, нарэшце, з адзінаццацю мясцовымі мяшчанамі, якія пагадзіліся плаціць мінімальную для таго часу арэндную суму – 40 коп грошай у год за карчму[45]. Крычаўскія мяшчане змаглі спыніць арэндную чахарду толькі аб'яднаўшыся ў таварыства, каб скласці агульны капітал, неабходны для арэнды. На такіх жа кампанейскіх ўмовах мяшчане бралі вялікакняжацкія корчмы ў арэнду і ў іншых месцах[46]. З такімі малазабяспечанымі мяшчанамі вялікі князь меў больш клопатаў, чым стабільнага заробку. Неабходна ўлічваць і тое, што ў пачатку XVI ст. па ўзроўню эканамічнага развіцця Русь адставала ад Літвы. Так, у 1500–1501 гг. у Бабруйску, Рэчыцы, Мозыры арэндная плата за мыты была ніжэйшай, чым за корчмы[47], што сведчыла пра слабую ўключанасць Усходняга Палесся ў міжнародны гандаль.

Асаблівай увагі заслугоўвае кантракт 1498 г., у адпаведнасці з якім Аляксандр перадаў у арэнду 40 корчмаў мяшчанам Смаленска (у ліку 21 асоба на чале з карчмаром Васілём) на тры гады. Арандатары згаджаліся "піва і мед пароўну мець". Акрамя мёда і піва, мяшчане-арандатары прадавалі *"вино горелое"* (так тады называлі гарэлку) [48], але па ўмове арэнднага кантракта не маглі гэты напой "з браги делати, нижли з тых жо дрожжеи медовых а пивных мают вино жечи»[49]. Новы прадукт, віно гарэлае, упамінаецца у гэтым дакуменце ўпершыню на тэрыторыі

[42] *Госцеў, А.П., Швед, В.В.* Кронон. Летопись города над Неманом. Гродно, 1993, с. 19; Metrika. Kn. 6: 1496–1506. № 407. С. 249; № 412. С. 251; № 424. С. 255; № 581. С. 339; № 624. С. 353.

[43] Тамсама. № 407. С. 249; № 412. С. 251; № 424. С. 255; № 581. С. 339; № 624. С. 353.

[44] Тамсама. №№ 573, 575.

[45] Тамсама. № 411. С. 251; № 416. С. 253; №№ 573, 575. С. 338; № 626. С. 354.

[46] Тамсама. № 394. С. 244–245; № 401. С. 247.

[47] Тамсама. № 418. С. 253; № 419. С. 253–254; № 420. С. 254.

[48] Так у зоне вінаробства называлі спірт, атрыманы з віна. Магчыма, што назва запазычана з габрэйскай мовы: "Yayın saruf".

[49] Тамсама. № 394. С. 244–245. Параўнаць павялічэнне арэнднай платы за карчму на аснове пазнейшых крыніц немагчыма, бо ў арэндных кантрактах гэтая лічба не вылучаецца.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ВКЛ. Больш ранняга ўпамінання выявіць не ўдалося[50]. Можна меркаваць, што смаленскія мяшчане перанялі тэхналогію вырабу гаролкі ў Маскоўскай дзяржаве, дзе яна прадавалася з канца XIV ст.[51] Як можна зразумець з дакумента, віно гаролае выраблялася з хлебнай брагі і з перабрадзіўшых медавухі ці піва. Забарона рабіць гаролку з брагі тлумачыцца імкненнем зберагчы зерне для харчавання. Паколькі ў Польскім каралеўстве гаролка спажывалася з XV ст. [52], то выходзіць, што суседзі ВКЛ – масквіціны (паводле тагачасных назваў, масквіціны, маскалі, маскавіты) і палякі – апярэджвалі мясцовых жыхароў у далучэні да самага моцнага напою.

У Метрыцы ВКЛ ёсць нямала дакументаў пра вымушанае прыняцце багатымі габрэямі хрысціянства, каб пазбегнуць выгнання і ўтрымаць свае багацці. У 1495 г. мыта і корчмы пуціўльскія (г. Пуціўль, Сумская вобласць, Украіна) на тры гады атрымаў у арэнду выхрыст Фёдар Новахрышчоны і яго зяць Петр. Арандатары мусілі пагадзіцца на высокую арэндную плату (266 коп грошай штогод), а таму хутка сталі даўжнікамі і прасілі вялікага князя абароны ад крэдытараў да выплаты арэнднай платы[53]. У 1498 г. арэнда была працягнута яшчэ на тры гады за 900 коп або 300 коп у год. У сувязі з павелічэннем арэнднай платы і фінансавымі цяжкасцямі да Фёдара і Пятра далучыўся Іван Новахрышчоны[54].

Відаць, толькі ў таварстве з прадстаўнікамі сям'і гэтых выхрыстаў віленскі мешчанін-багацей Онка Грыцэвіч пагаджаўся арандаваць смаленскія корчмы за значную суму ў ходзе вайны з Маскоўскай дзяржавай. У 1501 г. ён узяў смаленскія корчмы на водкуп разам са смаленскім мытнікам Фёдарам Новахрышчаным за 400 коп грошай, але толькі на адзін год. Мясцовыя мяшчане (21 чалавек) былі адхілены ад іх арэнды. Двум новым арандатарам смаленскіх корчмаў вялікі князь абяцаў, у выпадку нападзення непрыяцеля, паменшыць арэндную плату. Ён абавязваў сваіх намеснікаў абараняць арандатараў, каб не пацярпелі яго прыбыткі[55].

У 1502 г. Онка Грыцэвіч і смаленскія мытнікі Фёдар і Іван Новахрышчаныя атрымалі ў арэнду смаленскія корчмы яшчэ на два годы за 400 коп грошай на тых жа ўмовах. Аляксандр нават паменшыў Івану арэнду на 50 коп, бо яго з сям'ёй захапілі і білі людзі вялікага князя маскоўскага. Івану ўдалося ўцячы, а жонка з дзецьмі засталася ў палоне. На 30 коп была паніжана і арэндная плата для іншых арандатараў, бо гаспадарскія жаўнеры перашкаджалі ім гандляваць у корч-

[50] С.Бершацкі лічыць, што распаўсюджванне гаролкі адбылося ў пачатку XVI ст., пры Смгізмундзе I, калі па прыкладу данцыгскай шляхты гэты напой рассылаўся па ўсіх корчмах. Гл.: *Бершадский, С.А.* Литовские евреи… С. 150.

[51] Прыжов И. Корчма. Исторический очерк. С. 1059.

[52] Kobyliński, Maciej. Karczmy w dawnej Polsce. Рэжым доступа: http://www.polinow.pl/karczma-karczmy_w_dawnej_polsce

[53] Metrika. Kn. 6: 1496–1506. № 383. С. 250; № 284. С. 240–241.

[54] Тамсама. № 397. С. 245.

[55] Тамсама. № 422. С. 254–255.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

мах[56]. А гэта значыць, што арандатары не атрымалі ад вялікага князя манапольнага права на продаж напояў у Смаленску.

У тым жа 1502 г. Онку Грыцэвічу і Івану Новахрышчонаму перадаваліся ў арэнду гаспадарскія корчмы ў Менску на тры гады за 150 коп грошай[57]. Цікава, што вялікі князь і ў Менску зменшыў пацярпеламу ад маскоўскага непрыяцеля Івану Новахрышчанаму арэндную плату за корчмы да 100 коп грошай. Карыстаючыся фінансавымі цяжкасцямі вялікага князя, Іван прасіў аддаць яму менскія корчмы навечна за павышаную арэндную плату – 200 коп грошай штогод. І, сапраўды, Аляксандр, які цярпеў нястачу ў грошах у сувязі з вайной з маскоўскай дзяржавай, прыняў прапанову арандатара і ў 1503 г. паведаміў менскаму намесніку Богдану Жэслаўскаму пра сваю згоду пасля завяршэння Іванам трохгадовай арэнды. Пры гэтым Аляксандр скасаваў правамоцтва папярэдніх сваіх лістоў на вольныя корчмы ў Менску[58]. Не выключана, што такія жорсткія меры па выкананні манаполіі на продаж алкаголю былі "падказаны" арандатарамі, якія рызыкавалі, але спадзяваліся на вялікі прыбытак.

У той жа час удзельныя князі ВКЛ захавалі права адчыняць корчмы і дазваляць трымаць іх сваім падданым. У 1501 г. вялікі князь вымушаны быў пасля скаргі пінскіх мяшчан умяшацца ва ўнутраныя справы Пінскага княства і загадаць княгіні Марыі Сямёнаўне Александровіч зменшыць арэндную плату за корчмы і памер капшчызны, якую яна павысіла да 2 коп 20 грошай[59]. Не выключана, што такая сітуацыя склалася ў сувязі з выгнаннем габрэяў, калі скарацілася колькасць шынкароў і арандатараў корчмаў. Каб кампенсаваць страты прыбыткаў, княгіня вымушана была зрабіць кошты больш высокімі.

У адзін з арэндных кантрактаў вялікі князь уключыў пакаранне штрафам за выкарыстанне арандатарамі корчмаў нестандартных мер вадкасці ў гандлі напоямі[60]. Варта заўважыць, што такая неабходнасць узнікла ў перыяд выгнання габрэяў.

Мяркуючы па фрагментарных дадзеных, прыведзеных М. В. Доўнар-Запольскім, прыбытак ад капшчызны пры Аляксандры ў Бабруйску, Оўручы (зараз Жытомірская вобласць Украіны) і Крычаве быў невялікі. Прыбыткі сталі па-

[56] Тамсама. № 466. С. 275. Урэшце, мяшчане памежнага Смаленска дабіліся ад вялікага князя абавязацельства не трымаць у іх горадзе сваіх корчмаў. Гл.: *Кленов, Николай*. Величие и падение Смоленска. [Очерк истории этнического самосознания Смоленской земли в контексте ее политической истории] Рэжым доступа: http://actualhistory.ru/smolensk_rise_and_fall_2

[57] Беларускі архіў. № 9. 1502 г. С. V, 8. Дарэчы, прозвішча Новаахрышчоны сведчыць пра габрэйскае паходжанне Івана. І гэты факт пацвярджае, што ў перыяд выгнання габрэі маглі захаваць сваю камерцыйную справу толькі пры ўмове прыняцця хрысціянства.

[58] Metrika. Kn. 6: 1496–1506. № . 467. С. 276; № 506. С. 297.

[59] Тамсама. № 361. С. 231–232; Праўда, праз некалькі месяцаў вялікі князь ужо не настойваў на гэтым. Гл.: *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 102.

[60] Metrika. Kn. 6: 1496–1506. № 422. С. 254–255.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

вялічвацца толькі з 1503 г., калі ў ВКЛ габрэям было дазволена вярнуцца[61]. Ці паўплывала на гэта вяртанне габрэяў, цяжка сказаць.

Апора на адміністрацыю і каталіцкае духавенства. У апошні год свайго праўлення Аляксандр у справе арэнды усходніх корчмаў зрабіў стаўку на сваіх намеснікаў. У 1505 г. ён аддаў у арэнду полацкія корчмы полацкаму ваяводзе Станіславу Глебовічу на год за 600 коп грошай, узяўшы наперад 200 коп грошай. За такую вялікую арэндную суму вялікі князь дазволіў ваяводу мець корчмаў столькі, колькі ён захоча. Праўда, гаспадар захаваў корчмы і за тымі, хто раней меў на іх яго дазвол. А ў тых, хто будзе гандляваць півам і мёдам без дазволу, загадваў канфіскоўваць напоі[62]. Можна меркаваць, што гэтым самым гаспадар ВКЛ спрабаваў абмежаваць вольнасці полацкіх мяшчан.

У 1503 г. вялікі князь Аляксандр выдаў прывілей віцебскаму касцёлу Св.Троіцы на юрыдыку[63], вызваліўшы іх ад усіх паборaў на карысць казны і горада[64]. Атрымліваецца, што каталіцкае духавенства ў ліку першых дабівалася ад гаспадароў ВКЛ права на юрыдыкі ва ўсходніх гарадах і на адкрыццё ў іх вольных корчмаў. Побач з гаспадарскай адміністрацыяй яно выступала сродкам умацавання ўлады і ўплыву вялікага князя на Русі.

Падсумаванні. Такім чынам, пасля выгнання габрэяў вялікі князь Аляксандр меў праблемы з аддачай сваіх корчмаў у арэнду, асабліва на Русі. Мяшчане аказаліся ненадзейнымі арандатарамі з-за недахопу сродкаў. Ва ўмовах вайны з Маскоўскай дзяржавай знайсці арандатараў корчм ва ўсходніх землях ВКЛ было складана. І тут не абыйшлося без габрэяў-выхрыстаў. Фінансавыя цяжкасці прымушалі вялікага князя браць з арэнднай платы задатак ды і спаганяць яе заўчасна. Страты гаспадарскіх прыбыткаў у карчомным гандлі ды і іншых галінах эканомікі ВКЛ прымусілі Аляксадра ўзгадаць пра выгнаных габрэяў. Прысутнасць габрэяў была асабліва неабходнай у правядзенні эканамічнай каланізацыі Русі праз піцейны гандаль. Пасля вяртання ім прыходзілася пачынаць усё занава і ў больш складаных умовах на мясцовым рынку. У піцейным гандлі назіралася канкурэнцыя габрэяў з гаспадарскімі намеснікамі і духавенствам, якія паспелі некалькі ўмацаваць свае пазіцыі ў карчомным гандлі. Адным з вынікаў такіх перамен было ператварэнне габрэяў з вольных шынкароў у наёмных карчмароў вялікакняжацкай адміністрацыі і каталіцкага духавенства на яго юрыдыках.

---

[61] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 370.

[62] Metrika. Kn. 6: 1496–1506. № 555. С. 329–330.

[63] Юрыдыка — частка горада, якая падпарадкоўвалася феадалам і на жыхароў якой не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада магістрату.

[64] *Копысский, З.Ю.* Социально-экономическое развитие гродов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Мн., 1975. С. 31–32.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

У часы праўлення Жыгімонта I Старога (1506–1544)

Агульны стан

Вытворчасць. З пашырэннем піцейнага гандлю важным элементам вытворчасці алкаголю становіцца млын. Каб перамалоць вялікую порцыю соладу і забяспечыць выраб дастатковай для наведвальнікаў колькасці піва і гарэлкі, ручных жорнаў не хапала. Таму карчмар вёз солад на памол у млын. Гэта ўзбагачала млынароў. Некаторыя з іх куплялі бровары (вінакурні) і забяспечвалі карчмароў не толькі памолам солада, але півам і гарэлкай. Гэтым карысталіся ваяводы. Праз сваіх млынароў яны трымалі ў залежнасці ад сябе бедных шынкароў, якія не мелі броваряў, і карчмароў, якія не мелі млыноў[65].

Першае ўпамінанне пра бровары як самастойныя прамысловыя прадпрыемствы, дзе гналі гарэлку, выявілася ў Вільні ў 1522 г.[66] З броваряў напоі паступалі ў корчмы. Сталіца лідзіравала ў выкарыстанні новых тэхналогій і ў падзеле працы, калі вытворчасць гарэлкі аддзялалася ад гандлю ёй. Бровары былі драўлянымі, мелі мураваны комін. У іх знаходзіліся кваснікі для солада і медныя катлы для варэння піва. Для прыгатавання гарэлачнай брагі патрабавалася каля тыдня. Брага выспявала ў гарэлачных кваснікаx. У якасці натуральных дражжэй выкарыстоўваўся хмель. Гарэлка выраблялася ў спецыяльным прыстасаванні. Брага залівалася ў медны кацёл, з якога адводзілася труба. Па ёй гарэлачныя пары паступалі ў рэзервуар для ахладжэння, з якога і цякла крышталізаная ў вадкасць гарэлка. Такое прыстасаванне дазваляла атрымаць гарэлку мацункам 25–30 градусаў. А для больш моцнай патрабавалася другая перагонка[67].

Выгляд корчмаў. Як сведчыць прывілей вялікага князя 1508 г. пану Занку Яловічу, ён атрымаў права распараджацца карчмой у Бабруйску ў абоіх палавінах і з унутраным дваром[68]. У гэтым дакуменце ўпершыню выяўляюцца контуры выгляду заезнай карчмы, якая мела дзве палавіны і двор, гэта значыць пакой для продажу алкагольных напояў (шынок), пакоі для пастаяльцаў і стайню. Гарадскія корчмы вылучаліся ў асяроддзі гарадской забудовы сваімі памерамі, абавязковай наяўнасцю на даху коміна (існавалі дамы, якія абграваліся "па чорнаму") і выхадам да вуліцы тарцом[69]. Мяркуючы па прыкладу Польскага

[65] РИБ. Т. XX. Литовская Метрика. № 18. 1510–1517 гг. С. 17–18; № 153. 1515 г. С. 205.

[66] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 373–374.

[67] *Сліж, Наталля.* Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя. С. 59–60.

[68] Lietuvos Metrika: knyga Nr. 8 (1499–1514) / užrašymų knyga 8 = Литовская Метрика: книга записей 8 / parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius, Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. № 117. 1508 г. С 147. Далей – Metrika. Knyga Nr. 8: 1499–1514.

[69] *Сергачев, С.А.* Архитектура корчмы в Белоруссии. С. 148—156;

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

каралеўства, з вясковай карчмой звычайна быў злучаны хмяльнік, ворная зямля, луг, агарод[70].

Вольныя корчмы з ласкі гаспадара. Вялікі князь Жыгімонт I часцей за сваіх папярэднікаў адступаў ад свайго манапольнага права і аддаваў у карыстанне свае корчмы прадстаўнікам адміністрацыі і шляхце "за службу" або за нейкія заслугі як на пэўны тэрмін, так і ў пажыццёвае карыстанне[71].

Акрамя таго, гаспадарскія корчмы па-ранейшаму перадаваліся каталіцкаму духавенству "на пожывенне", а, часам, і праваслаўнай царкве[72]. Жыгімонт I мог аддаць іх у карыстанне крэдытару дзеля кампенсацыі пазыкі[73], а таксама ў дабрачынных мэтах для пакрыцця стратаў, панесеных падданымі гаспадара падчас няшчасных выпадкаў. Манарх дазваляў сабе перадачу ўласных корчмаў і сваім дваровым слугам[74]. Пазней гэта ж рабіў і яго пераемнік Жыгімонт Аўгуст[75].

У 1509 г. Жыгімонт I выдаў слонімскаму гаспадарскаму шляхціцу Фёдару Валошыну грамату на права будаўніцтва ўласнай карчмы ў яго шляхецкім двары за добрасумленнае выкананне земскай службы[76]. І гэта ёсць першы факт дакумен-

---

[70] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C. 25, 31. І сапраўды, некаторыя піавары з Гарадзеншчыны мелі нават лугі хмелю. Гл.: *Гардзееў, Юры.* Магдэбургская Гародня. Гародня – Wrocław, 208. С. 306.

[71] Lietuvos Metrika (1522–1530) 4–oji Teismų bylų knyga (XVI a pabaigos kopija) = Литовская метрика: 4–я книга судных дел. Vilniaus universiteta leidykla. Vilnius 1997. № 482. 1530 г. С. CXXXIII. Далей – Metrika. Knyga № 4: 1522–1530. Metrika: knyga Nr. 8 (1499–1514). № 104. 1507 г. С 140; № 232. 1507. С. 208; № 144. 1510. С 157; Lietuvos Metrika: knyga Nr. 11 (1518–1523) / įrašų knyga 11 = Литовская Метрика: книга записей 11 / parengė A. Dubonis, Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1997. № 84. С. 101. Далей – Metrika: knyga Nr. 11 (1518–1523). Lietuvos Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529) / užrašymų knyga 12 = Литовская Метрика: книга записей 12 / parengė D. Antanavičius ir A. Baliulis, Vilnius: Žara, 2001. № 198. С. 230. Далей – Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). Беларускі архіў. № 15. 1511 г. С. 13.

[72] Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 61. С. 109–110; № 537. С. 429; № 669. С. 512. Metrika. Knyga № 4: 1522–1530. № 14. 1522 г. С. 52–53. Metrika: knyga Nr. 11 (1518–1523). № 70. 1519 г. С. 84–85; Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 537. С. 420. Удел духавенства ў карчомным гандлі ў прагледжаных аўтарам дакументах не адлюстраваўся дастаткова заўважна.

[73] Пичета, В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 429.

[74] Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 55. С. 153.

[75] Lietuvos Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574) / užrašymų knyga 51 = Литовская Метрика: книга записей 51 / parengė A. Baliulis, A. Ragauskas ir R. Ragauskienė, Vilnius: Žara, 2000. № 94. С. 120. Далей – Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574). Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 30 (1480–1546). Кніга запісаў канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. А.А.Мяцельскі. Мінск "Беларуская навука" 2008. № 161. Далей – Метрыка. Кніга № 30 (1480–1546). Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 42 (1556–1562). Кніга запісаў № 42 (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. В.С.Мянжынскі. Мінск "Беларуская навука" 2015. № 77. С. 97–98; № 78. С. 98. Далей – Метрыка. Кніга № 42 (1556–1562). Lietuvos Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570) / užrašymų knyga 52 = Литовская Метрика: книга записей 52 / parengė A. Baliulis ir R. Firkovičius, Vilnius: Žara, 2004. № 196. С. 143. Далей – Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570).

[76] Уваров, И.Ю. Город Слоним в XVI веке. Режим доступа: http://www.slonim.org/modules/sections/index.php?op=printpage&artid=22

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

тальнай лакалізацыі карчмы ў шляхецкім маёнтку. Пазней практыка заснавання з дазволу вялікага князя корчмаў у маёнтаках стала пастаяннай з'явай[77].

Земляўласнікі, якія атрымалі ад вялікага князя дазвол на корчмы, абавязаны былі плаціць капшчызну ў гаспадарскі скарб. Гэта давала ім магчымасць не толькі прадаваць, але вырабляць алкаголь пры дазволенай карчме[78]. Права карчмы набліжалася да прапінацыйнага права[79], якім польская шляхта карысталася з XIII ст., а з пачаткам працы сейма дамаглася прызнаць гэта афіцыйна ў заканадаўчым парадку (1496 г.)[80]. Калі ў Польскім каралеўстве права на карчму супадала з прапінацыйным правам[81], то ў ВКЛ такога не было, бо мясцовым землеўладальнікам не хапала дазволу на вольнае заснаванне корчмаў па ўласнай ініцыятыве.

Пры Жыгімонце I асобныя землеўладальнікі шляхецкага стану атрымлівалі ад гаспадара "на вечность" права засноўваць мястэчкі ды мець у іх торг і корчмы[82]. У некаторых выпадках уладальнікам мястэчак дазвалялася збіраць капшчызну на сваю карысць і нават прадаваць гэта права іншай асобе[83]. Аднак трэба мець на ўвазе, што шчаслівыя маёнткі знаходзіліся на тэрыторыі гаспадарскай вотчыны, былі ўласнасцю буйных паноў і служылых князёў, а таму і вылучаліся сваімі прывілеямі[84].

Як сведчаць прыведзеныя дакументы, Жыгімонт I рабіў уступкі толькі прадстаўнікам шляхецкага стану, якія маглі набыць ад вялікага князя ў карыстанне як зямлю, так і карчмы[85], каб эксплуатаваць іх самім або здаваць у арэнду. Пры раздачы прывілеяў на гандаль напоямі Жыгімонт I прытрымліваўся прынцыпаў

---

[77] Lietuvos Metrika: knyga Nr. 25 (1387–1546) / užrašymų knyga 25 = Литовская Метрика: книга записей 25 / parengė D. Antanavičius ir A. Baliulis, Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. C. XXII. № 112. C. 169–170; № 148. C. 209–210; № 15. C. 243–244. Далей – Metrika: knyga Nr. 25 (1387–1546). Lietuvos Metrika (1506–1539) Kn. 7, Užrašymų knyga 7 / Lithuanian Metrica: Book No. 7. Book of Inscriptions 7 / Parengė Inga Ilarienė, Laimontas Karalius, Darius Antanavičius. Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2011. № 329. C. 550; № 358. C. 577–578. Далей – Metrika. Kn. 7 (1506–1539). Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 450. C. 361–362; № 610. C. 470.

[78] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка…С. 363.

[79] Прапінацыйнае права – гэта выключнае права памешчыкаў на выраб і прадажу алкагольных напояў сваім прыгонным сялянам.

[80] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C. 37–38; *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 81; Maciej Kobyliński. Karczmy w dawnej Polsce. http://www.polinow.pl/karczma-karczmy_w_dawnej_polsce

[81] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C.80.

[82] Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 65. C. 193; № 331. C. 298; № 412. C. 339; № 604. C. 463. У Польскім каралеўстве ўладальнікі маёнткаў арганізоўвалі мястэчкі з торгам і корчмамі з другой паловы XIII ст. Гл: *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C. 17–18.

[83] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 364.

[84] *Ён жа.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 85.

[85] Па назіраннях С.Бершадскага, вялікі князь не вельмі шчодра дзяліўся гэтым правам. Гл.: *Бершадский, С.А.* Литовские евреи… С. 276.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

бязшкоднасці вольных корчмаў для сваіх карчомных прыбыткаў і карыснасці вольных корчмаў для паслоў і купцоў[86].

Карчомныя паслугі. У корчмах прадаваліся на разліў спачатку традыцыйныя пітны або "сычаны" мед і, пераважна, ячменнае піва[87], а пазней – хлебная гарэлка[88]. Яе мацунак, мяркуючы па заходнееўрапейскіх узорах, вымяраўся 47–50 градусамі[89]. Віно піло не ўсё насельніцтва ВКЛ, а толькі багатыя. Таму ў шынках і корчмах яго не было[90]. Там жа наладжваўся продаж хлеба, мяса, рыбы і рознай гародніны[91]. Пры неабходнасці, пры карчме маглі адрамантаваць воз, накарміць і падкаваць коней. У 1540 г. у Гародні існавала карчма Сідара, дзе акрамя алкаголю да паслуг прапаноўваліся жанчыны лёгкіх паводзінаў. Частай наведвальніцай гэтай карчмы была Багдана Алехнава, якая абвінавачвалася ў зводніцтве ва ўласным доме[92].

Спажыўцы. Статут 1529 г. засведчыў факт найбольшай распаўсюджанасці ў ВКЛ піўных корчмаў і шынкоў, у тым ліку патаемных, куды сцякаліся "нізы" грамадства і квітнела злачыннасць. У дакументах Гарадзенскага земскага суда 1540–1541 гг. зафіксаваны скаргі пацярпелых у ходзе боек, якія лічыліся тыповай з'явай для ўсіх корчмаў, дзе наведвальнікі былі на добрым падпітку[93]. Жыгімонд I глядзеў на гэта "скрозь пальцаў". Заўзятарамі гарадзенскіх корчмаў выступалі мяшчане, рамеснікі, прадстаўнікі вялікакняжацкай адміністрацыі (яго падданыя, баяры) [94]. Наведванне габрэямі хрысціянскіх корчмаў таксама не было зусім заказана[95].

У пазагарадскіх корчмах Гарадзенскага павета можна было сустрэць гаспадарскіх татар, баяр, прадстаўнікоў валасной адміністрацыі, рамеснікаў, пушкароў, прыгонных сялян і розных гаспадарскіх падданых[96]. Шляхцічы не былі

---

86 Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 54. С. 103.

87 Хмяльны мёд і піва былі вядомы з часоў паганства, калі яны ўжываліся пераважна ў якасці рытуальных напояў. Піва варылася з пшаніцы, аўса, жыта, ячменя, проса, полбы, але на беларускіх землях выкарыстоўваўся пераважна ячмень.

88 У паўднёвых краінах Еўропы спірт атрымліваўся шляхам перагонкі віна.

89 *Бродэль, Фернан.* Материальная цивидизация, экономика и капітализм, XV–XVIII вв. Том I. Структкры повседневности: возможное и невозможное. Ред. Ю.Н.Афанасьев. Москва 2006. С. 214.

90 Тут не ідзе гаворка пра віно, якое вырабляла ці набывала духавенства для рытуальных патрэбаў. Іудзеі ВКЛ, напрыклад, рабілі ізюмнае віно.

91 *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. С. 25, 31.

92 АВАК. Т. XVII. Вильно 1890. № 571. 1540 г. С. 211.

93 Тамсама. № 628. 1540 г. С. 231.

94 Тамсама. № 463. 1540 г. С. 171; № 628. 1540 г. С. 231; № 571. 1540 г. С. 211; № 764. 1541 г. С. 297; № 892. 1541 г. С. 360; Рэгесты. Т. 1. С. 190.

95 АВАК. Т. XVII. № 892. 1541 г. С. 360; Рэгесты. Т. 1. С. 190.

96 АВАК.№ 366. 1540 г. С. 143; № 413. 1540 г. С. 154; № 470. 1540 г. С. 174; № 575. 1540 г. С. 212; № 620. 1540 г. 227. Не зразумела толькі часам у чыёй ўласнасці названыя ў судовых дакументах корчмы належалі: вялікаму князю, пану-землеўладальніку, або прыватным асобам.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

выключэннем. У адным з артыкулаў Статута ВКЛ 1529 г., а потым і 1566 г. адзначалася, што яны ездзілі па пірах або корчмах[97], а іх любімым заняткам была гульня ў косці[98].

Прыбытковасць корчмаў. Справаздача дзяржаўнага казначэя Абрама Езафовіча аб дзяржаўных даходах з мытаў і гандлю моцнымі напоямі (карчэмных збораў) за 1511 г. паказвае, што гандаль алкаголем ў каралеўскіх корчмах прыносіў казне 660 коп гадавога даходу, а мытныя зборы давалі – 8166 коп грошай у год. Карчэмны збор складаў 7,3% ад мытнага[99]. І гэта сведчыць пра большую прыбытковасць знешняга аптовага гандлю ў параўнанні з унутраным рознічным. Але і карчэмны гандаль быў прыбытковым, а галоўнае – пастаянным і надзейным. Прыбыткі асобных корчмаў былі не такімі вялікімі, як ад мытні, але з павялічэннем колькасці корчмаў, павялічваўся і прыбытак. Карчэмны гандаль атрымаў шырокую папулярнасць. Калі ўлічыць, што да сярэдзіны XVI ст. з кожнай карчмы за гандаль мёдам і півам спаганялася па адной капе, то выходзіць, што у 1511 г. у Жыгімонта I было 660 корчмаў. Вядома, што Казімір Ягелончык здаваў уласныя корчмы ў арэнду ў 48–і гарадскіх паселішчах ВКЛ. Нават калі ў кожным горадзе ён меў па 10 корчмаў, то іх колькасны рост нават ад года смерці вялікага князя (1492) быў значным.

Падаткі на гандаль вызначаліся ў ВКЛ па прыбытковасці прадажаў. У Кляшчэлях Бельскага павета ў 1523 г. капшчызна па сваіх памерах была большай, чым зборы ад гандлю ў розніцу[100]. Гэты факт ускосна сведчыць, што гандляваць алкагольнымі напоямі было больш выгадна, чым іншымі таварамі.

Як ужо было не цяжка заўважыць, права на карчэмны гандаль вялікі князь, звычайна, прадаваў разам з арэндай мытняў і іншых збораў. У такім разе арандатары, як і прадпрымальнікі ва ўсім свеце, атрымлівалі магчымасць дзяліць рызыку паміж дзвюма справамі. Гэта прывабліва буйных адкупнікоў і павялічвала прыбыткі гаспадарскай казны. Корчмы каля мытняў служылі месцам пастою для купецкіх вазоў. Гаспадарскія корчмы таму і ставіліся каля людных месцаў, каб атрымаць ад продажу алкаголю большы даход: на гандлёвых шляхах, ля рачных перапраў і прыстаняў, пры млынах[101]. У гарадах карчма размяшчалася на рынкавай плошчы[102]. Аднак, самы вялікі прыбытак прыносілі корчмы на вялікіх гандлёвых шляхах.

---

[97] Гл: Статут ВКЛ 1529. Раздзел 6, п.10. С. 178–179; Статут ВКЛ 1566 года. Раздзел 11, п. 34.

[98] Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 67. с. 117–118.

[99] РЕА. Т. 3. С. 99–100.

[100] Metrika: knyga Nr. 25 (1387–1546). С. XXII. № 57. С. 120. Прыведзны ільготныя тарыфы, якія ўводзіліся, каб прывабіць перасленцаў у мястэчка, аднак гэта не зніжае іх вартасць для ацэнак суадносін паміж велічынямі падаткаў.

[101] Lietuvos metrika Kn. 37: (1552–1561); Užrašymų knyga 37/ Lithuanian Metrica: Book No. 37 Book of Inscriptions 37/ Parengė Darius Baronas – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2011. № 198. 1558 г. С. 249–250. Далей – Metrika. Kn. 37 (1552–1561).

[102] Прыжов И. Корчма. Исторический очерк. С. 1056.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Капшчызна. У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, Жыгімонт I імкнуўся збіраць капшчызну з дапамогай асобных скарбавых агентаў. З карчмы толькі мядовай або толькі піўной бралася капа грошай, з карчмы піўной і мядовай – 2 капы грошай, а з гарэлачнай – паўкапы грошай. Такі тарыф быў устойлівым, бо ўсе прытрымліваліся "старыны" [103]. Больш нізкі збор з гарэлачнай карчмы хутчэй за ўсё можна патлумачыць невялікай яе папулярнасцю сярод мясцовых спажыўцоў таго часу. Іх стрымлівалі і высокія кошты на гарэлку і, відаць, яе нізкая якасць з-за недасканаласці перагоннага абсталявання.

Водкупы. Вялікаму князю было выгадней збіраць капшчызну цэнтралізаваным парадкам. Піцейны збор з "вольных" карчмароў і шынкароў манарх імкнуўся аддаць адкупнікам. У такім разе капшчызна з вольных корчмаў збіралі для князя адкупнікі. Яна паступала ім у рукі, а не непасрэдна ў казну. Адкупнікі выйгравалі таму, што велічыня капшчызны загадзя фіксавалася ў арэнднай дамове, аднак, яна была меншай за фактычную, якую арандатар здабываў, дзякуючы жорсткаму ўліку існуючых корчмаў і ўзнікненню новых. Агавораную ў кантракце суму піцейнага падатку ён аддаваў у вялікакняжацкую казну, а рэшту браў сабе.

Здачай у арэнду асобных гаспадарскіх корчмаў, у адрозненне ад папярэднікаў, Жыгімонт I не займаўся. Арэндная плата ад іх аддавалася на водкуп разам з капшчызнай.

Удзел адміністрацыі. Кантроль за зборам капшчызны з прыватных корчмаў, перадача гаспадарскіх корчмаў у арэнду асобным карчмарам і арганізацыя водкупаў знаходзіліся ў руках намеснікаў-дзяржаўцаў[104]. Яны рабілі гэта двума спосабамі: у выглядзе абкладання кожнай карчмы капшчызнай або шляхам аддачы гэтага падатку на водкуп[105]. Доўгі час гаспадарка вялікага князя вялася адвольна, на аснове разнастайных лістоў і прывілеяў манарха. У 1514 г. для дзяржаўцаў і стараст была выдадзена ўстава, якая абмяжоўвала іх свавольства. Мяркуючы па сітуацыі ў Гародні, карчомныя грошы з вотчынных уладанняў вялікага князя браліся пад яго кантроль і павінны былі паступаць непасрэдна ў скарб[106]. Адкупнікамі маглі быць прадстаўнікі гаспадарскай адміністрацыі. У памежных гарадах гаспадарскім намеснікам давалася права выкарыстаць частку карчомных збораў не толькі на "кармленне", але і на ўтрыманне слуг, пушкароў і замка (напрыклад, для набыцця мсціслаўскаму замку пораху і пушак у 1529 г. у сувязі з вайной з Маскоўскім княствам) [107]. Паступленні ад піцейнага збору ішлі і на фармаванне мясцовых бюджэтаў.

[103] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 369.
[104] Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 157.
[105] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 301.
[106] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 83–88.
[107] Metrika. Kn. 7 (1506–1539). № 288. С. 504; Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 475. С. 379.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Вытворчасць алкаголю. Вялікі князь па-ранейшаму меў манаполію толькі на продаж напояў. Выраб іх не забараняўся, але яшчэ ў большай меры рэгламентаваўся: нават на святы дазваляўся толькі ў абмежаваным памеры[108]. Вольна вырабляць напоі без абмежаванняў часам дазвалялася каталіцкаму духавенству для ўласных патрэбаў. У такім разе яны не плацілі падатак, бо ў іх выпадку падаткам абкладваўся толькі продаж алкаголю[109].

Сустракаюцца асобныя факты падаткаабкладання вытворчасці напояў. У прывілеі ў г. Вільні ў 1522 г. зафіксавана плата з броваряў ратушы. У гаспадарскім прывілеі 1531 г. мяшчанам сталіцы дазвалялася мець вольныя бровары з платай за кожны па 4 салянкі соладу[110]. Значыць, у сталіцы з'явіліся адасобленыя ад корчмаў бровары, а таму яны і падлягалі падаткаабкладанню. Можна меркаваць, што гэта былі бровары для вырабу гарэлкі, якая добра захоўвалася. Мёд і піва стараліся вырабляць пры корчмах, бо гэтыя напоі хутка псаваліся.

Статутам ВКЛ 1529 г. уводзілася манаполія вялікага князя не толькі на продаж, але і на выраб піва (Раздзел 3. "О вольносцях шляхты…", п. 17.). На ваяводаў, старастаў і дзяржаўцаў ускладваўся абавязак не дазваляць усім без выключэння варыць піва без дазволу вялікага князя, забіраць тыя сасуды, у якіх вараць піва, і дастаўляць іх да княжацкага двара. Далей удакладнялася, што з-за існавання патаемных корчмаў здзяйсняецца шмат злачынстваў і памяншаюцца прыбыткі гаспадара або яго аддкупнікоў піцейнага збора[111]. Манаполія на продаж піва без манаполіі на яго вытворчасць паказала сябе неэфектыўнай. Забараняць варыць піўны мёд і вырабляць гарэлку лічылася, відаць, немэтазгодным, бо мёд траціў сваю папулярнасць, а гарэлка яшчэ не набыла яе. Не выключана, што ўвесці манаполію на вытворчасць піва не ўдалося, бо ў Статуце 1566 г. параграф аб забароне усім варыць піва без дазволу гаспадара адсутнічае. Забараніць людзям варыць піва нават тэхнічна было немагчыма.

Гарэлачныя корчмы. Ліст Жыгімонта Старога 1511 г. да адміністрацыі Навагрудка сведчыць, што са з'яўленнем гарэлкі і гарэлачных корчмаў вялікі князь перадаваў гэтыя корчмы ў распараджэнне замкавага ўрада і толькі піўныя і мядовыя корчмы дазволіў трымаць мяшчанам за плату[112]. Наўрад ці такая разделенасць тлумачыцца імкненнем вялікага князя трымаць ужыванне моцнага напою пад сваім кантролем дзеля стрымлівання п'янства. Рабілася гэта не толькі таму, што гарэлачныя корчмы, як не папулярныя і малапрыбытковыя, яшчэ не карысталіся ў арандатараў попытам. Такую палітыку можна расцаніць і як свядомую ці не свядомую спробу ўвядзення вялікакняжацкай манаполіі на вытворчасць і продаж гарэлкі. Ды і манаполію на гарэлку, у параўнанні з півам або медам, было прасцей рэалізаваць, бо рабіць яе ў хатніх умовах, відаць, яшчэ не ўмелі.

[108] Metrika. Kn. 4 (1522–1530). № 281. 1528. С. 240.
[109] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 300–301.
[110] *Ён жа* .Дзяржаўная гаспадарка… С. 373–374.
[111] Гл.: Статут ВКЛ 1529 г. С. 153.
[112] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 365.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Удзел габрэяў

Магчымасці для ўдзелу ў піцейным гандлі. Вялікі князь не надзяляў габрэяў ільготамі ў карчомным гандлі. Трымаць з ласкі гаспадара вольныя корчмы без аплаты капшчызны ім не выпадала. Але габрэйская галеча і не чакала такой прывілеі ды вырабляла і прадавала алкаголь патаемна. Заможныя габрэі трымалі вольныя корчмы або шынкі ва ўласных або арандаваных дамах і, як мяшчане, плацілі капшчызну[113]. Багацейшыя ж бралі гаспадарскія корчмы на водкуп.

Адкупнікі браты Езафовічы. Войны і прыдворнае жыццё патрабавала шмат грошай. Вялікі князь вымушаны быў часам браць крэдыт у паноў і габрэяў. Найбольшым даверам сярод габрэяў-адкупнікоў карысталіся ў Жыгімонта I браты Езафовічы. Прыняўшы хрысціянства, Абрам Езафовіч стаў у 1505 г. смаленскім старастам і атрымаў ад вялікага князя піцейны водкуп, а за службу – яшчэ і корчмы ў Менску і Смаленску[114], там, дзе было асабліва складана і небяспечна, побач з агрэсіўным Маскоўскім княствам. Смаленскія корчмы Езафовіч здаваў ад імя вялікага князя у арэнду мясцовым князям, панам, баярам і шляхце. А ў 1509 г. ён прывёз Жыгімонту I у Кракаў арэндную плату[115]. У 1509 г. вялікі князь аддаў у арэнду старасту смаленскаму і войту менскаму Абраму Езафовічу на тры гады полацкія корчмы. Езафовіч ўзяў водкуп, хоць гаспадар не забяспечыў яму поўную манаполію на продаж напояў: у горадзе захоўваліся вольныя, не падпарадкаваныя арандатару корчмы полацкага ваяводы і пушкароў. Больш таго, ён згадзіўся выплаціць вялікаму князю арэндную плату адразу за тры гады[116]. Стараннасць і адказнасць, фінансавыя здольнасці і асабістая энергія дазволілі прадпрымальнаму Абраму Езафовічу заняць у 1510 г. пасаду земскага падскарбія ВКЛ (паводле сучаснай тэрміналогіі: міністра фінансаў) [117].

Браты Аўрама (Міхель, Айзак і Песах) заставаліся іудзеямі, але пры яго падтрымцы таксама дасягнулі ў прадпрымальніцтве, у тым ліку і ў піцейным гандлі, значных поспехаў, асабліва Міхель[118].

Зацікаўленасці габрэяў. Можна меркаваць, што ў ВКЛ у першай палове XVI ст. найбольшыя абароты і прыбыткі ў рознічным гандлі давала прадаж алкагольных напояў і солі[119]. Не выпадкова, што гарадзенскі габрэй Хацко Ісаковіча пагадзіў-

[113] РЭА. Т.1. С. 104–105.

[114] РЭА. Т.3. С. 31–32.

[115] Metrika: knyga Nr. 8 (1499–1514). № 138. 1509 г. С 155.

[116] Тамсама. № 123. 1509 г. С. 149.

[117] Гл.: *Бершадский, С.А.* Аврам Езофович Ребичкович // Киевская старина №12, 1888.

[118] Metrika. Kn. 4 (1522–1530). № 14. 1522 г. С. 52–53; № 15. 1522 г. С. 53; № 21. 1522 г. С. 57; № 42. С. 69–70; № 222. 1525 г. С. 189. Metrika. Kn. 7 (1506–1539). № 347. 1514. С. 567–568; Metrika: knyga Nr. 11 (1518–1523). № 69. 1519 г. С. 83–84; № 70. 1519 г. С. 84–85; № 120. 1522 г. С. 122–123; РЭА. Т.1. С. 100; *Бершадский, С.А.* Литовские евреи… С. 365; *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 120; *Пичета В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа... С. 26–27

[119] РЭА. Т. 2. 1561 г. С. 90). М.Доўнар-Запольскі не даацэньвае прыбытковасць карчомнага гандлю. Гл.: *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 370.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ся перадаць у 1526 г. водкуп ліпнішскіх корчмаў віленскаму ваяводу Альбрэхту Гаштольду толькі за 300 коп грошай адступных[120]. Водкупы на мытні і корчмы давалі, па сутнасці, магчымасць кантраляваць знешні і ўнутраны гандаль ВКЛ, таму габрэйскія багацеі выяўлялі вялікую зацікаўленасць у сукупным апанаванні гэтых сродкаў.

Забяспечыць манаполію на продаж алкаголю, якую перадаваў габрэям-адкупнікам гаспадар ВКЛ было не так проста. Габрэйскія арандатары выклікалі асаблівую незадаволенасць у хрысціян. У 1523 г. і 1524 г. мытнік Міхель Езафовіч скардзіўся Жыгімонту, што мяшчане Магілёва і Віцебска парушалі яго манаполію на продаж алкаголю: варылі мёд і трымалі корчмы[121]. У сувязі з тым, у габрэяў былі матывы для таго, каб выступіць ініцыятарамі ўвядзення манаполіі вялікага князя не толькі на продаж, але і на вытворчасць алкаголю. У 1528 г. магілёўскія корчмы і права вырабляць алкагольныя напоі былі перададзены вялікім князем берасцейскім габрэям Айзаку Езафовічу, Агрону Салашэвічу і Якаву Машаевічу, а таксама цікоцінскім габрэям Шахну Гальшэвічу і Еску Песафофічу[122]. З прыведзенага дакумента вынікае, што кампанія габрэйскіх адкупнікоў піцейнага збору дабілася ад вялікага князя манаполіі не толькі на продаж, але і на вытворчасць алкагольных напояў. Праз год гэтае права, што праўда толькі на выраб піва, было ўключана, як вядома, у Статут ВКЛ 1529 г.

Канкурэнцыя. Першыя выявы канкурэнцыі ў піцейным гандлі ўдалося знайсці ў скарзе мяшчан г. Камянецка (цяпер Камянец-Падольск Хмяльніцкай вобласці Украіны) на габрэяў, пададзенай у 1523 г. вялікаму князю. Габрэі абвінавачваліся ў скупцы корчмаў. Мяшчане прасілі вярнуць іх ім назад. Прайграўшы ў канкурэнтнай барацьбе, яны шукалі падтрымкі вялікага князя. Жыгімонт Стары пагадзіўся пры ўмове, што камянецкія мяшчане будуць плаціць капшчызну, якую раней уносілі габрэі[123]. У далейшым таксама гаспадар ВКЛ у эканамічных спрэчках паміж габрэямі і мяшчанамі-хрысціянамі падтрымліваў апошніх.

Былі выпадкі, калі вялікі князь прадаваў правы на збор капшчызны гарадам. Так, у 1541 г. Жыгімонт I Стары дараваў гарадзенскай ратушы прывілею на збор капшчызны за 50 коп грошай у год і забараніў прадаваць алкагольныя напоі ў горадзе і прадмесці ўсім іншым, акрамя мяшчан. Габрэі маглі шынкаваць (г. зн. гандляваць алкагольнымі напоямі) з дазволу магістрата, але абавязаны

[120] PEA T.1. № 114. C. 145–146.

[121] Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 14 (1524–1529); Užrašymų knyga 14 / parengė D. Antanavičius (tekstai lotynų kalba) ir L. Karalius, Vilnius: LII leidykla, 2008. № 109 (106). C. 120; РЭА. Т.2. 1562 г. С. 103–104.

[122] Metrika. Kn. 4 (1522–1530). № 281. 1528, C. 240. Праўда, водкуп гаспадарскіх корчмаў і раней азначаў манаполію і на продаж і на выраб алкагольных напояў, які вёўся пры карчме. Адсюль і назва – "карчомная гарэлка"

[123] Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 197. C. 229–230.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

былі плаціць капшчызну ў гарадскую казну[124]. Магістрат атрымаў магчымасць стрымліваць габрэйскі гандаль напоямі. Вярхоўная ўлада давала перавагу гарадзенскім мяшчанам над мясцовымі габрэямі ў гандлі алкагольнымі напоямі. Дарэчы, іншым гарадам, падобна Гародні, таксама ўдавалася атрымаць капшчызну за пэўную гадавую плату ў скарб[125].

Канкурэнцыя паміж мяшчанамі і габрэямі не магла набыць вялікіх памераў, паколькі габрэі далёка не былі манапалістамі ў піцейным гандлі. Як сведчаць матэрыялы Гарадзенскага земскага суда 1540–1541 гг., шмат корчмаў і шынкоў[126] у Гародні належала і хрысціянам, а за межамі горада (у дакументах пазначаны Індура і Новы Двор), яны знаходзіліся пераважна ў руках негабрэяў[127].

Пераход на арэнду корчмаў шляхты. Сельская корчма, якая знаходзілася ў руках габрэя, упершыню ўзгадваецца ў закладным лісце ўдзельнага князя Фёдара Яраслававіча ў 1519 або 1520 г., калі ён дзеля забеспячэння пазыкі ў Айзака Езафовіча здаваў яму ў арэнду Вядскую карчму і возера Вядскае (Вяды – валасны цэнтр) на 5 зімаў[128].

Пазней, калі землеўладальнікі дабіваліся дазволу засноўваць у сваіх мястэчках вольныя карчмы, яны здавалі іх у арэнду, бо лічылі бізнэс, і асабліва гандаль гарэлкай, абразлівым для сябе заняткам. Сярод арандатараў былі габрэі[129]. Удзел габрэяў у пашырэнні вольных корчмаў шляхты ў мястэчках зафіксаваны найперш у Гарадзенскім павеце, дзе прадстаўнікі гарадскога кагалу найбольш рассяліліся па мястэчках[130]. Праца карчмароў-габрэяў у вольных панскіх корчмах была небяспечнай. Яны сутыкаліся там са шляхецкім свасольствам і вясковай стыхіяй і ў далечыні ад яўрэйскай абшчыны адчувалі сябе безабароннымі. У 1540 г. у Гарадзенскім земскім судзе разглядалася скарга габрэйскага карчмара Янчыка з Саколкі на гаспадарскага падданага Мацея Несцяровіча, які, маючы сваю вянчальную жонку, гвалтам узяў шлюб з яго падчарыцай у той час, калі карчмар павінен быў удзельнічаць у ловах (памешчыцкая павіннасць), наладжаных яго гаспадаром. Абвінавачанаму не ўдалося даказаць, што ён зра-

[124] Гэтыя ільготы гарадзенскім мяшчанам засведчаны і ў больш позніх дакументах: прывілей 1589 г. Жыгімонта III Ваза. (Гл.: АВАК. Т. VII. Акты Гродзенского гродского суда. № 26. 1589 г.) і пазнейшы акт Гродзенскага земскага суда. (Гл.: АВАК. Т. VII. Акты Гродзенского гродского суда. № 28. 1601 г.)

[125] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 368.

[126] Як сведчаць судовыя рашэнні, у Бярэсці шынкі мелі яшчэ назву піўніцы (1516 г.) або піцейныя дамы (кгельды) (1569 г.). Гл.: РЭА. Т. 3.С. 113; Т. 2 . С. 237.

[127] АВАК. Т. XVII. № 463. 1540 г. С. 171; № 628. 1540 г. С. 231; № 571. 1540 г. С. 211; № 764. 1541 г. С. 297; № 892. 1541 г. С. 360. Рэгесты. Т. 1. С. 190.

[128] Metrika. Kn. 4 (1522–1530). № 16. 1522 г. С. 53. Зусім лагічна меркаваць, што закускай ў той карчме была рыба. У сушаным выглядзе яе смак аматары піва, відаць, цанілі ўжо ў той час.

[129] РЭА.Т. 2. С. 142.

[130] Гарадзенскі земскі суд, юрыдыкцыя якога была пашырана не негарадскія паселішчы, быў завалены скаргамі габрэяў, што сведчыць пра іх шырокае рассяленне ў сельскай мясцовасці Гарадзенскага павета.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

біў гэта са згоды жонкі Янкеля. Сведкі выказалі ўпэўненасць, што Мацей быў абвенчаны з Радзюшай у Адэльску[131]. Аднак, не ўсё так спрыяльна заканчвалася для габрэйскіх карчмароў. У корчмах часта здараліся бойкі і нават забойствы[132]. У 1540 г. Гарадзенскі земскі суд разбіраў скаргу новадворскага дзяржаўцы Сімона Геца на баярына пана Богуфала Дарашкевіча-Шаблыку, які ноччу разам са сваімі памочнікамі наехаў на яго карчму, пабіў жонку карчмара Зафію і карчомных працаўнікоў Янку Дубаталковіча і Аўдзея Лусаковіча, вырваў у карчмаркі машну з трыма копамі грошай і разагнаў наведвальнікаў, якія не заплацілі за свае заказы[133].

Наезды шляхты адзін на аднаго былі тыповай для таго часу з'явай. У выніку цярпелі і карчмары[134]. Выключна галеча і жаданне пазбавіцца ад празмернай апекі кагальнай вярхушкі прымушала габрэйскую сям'ю выбіраць арэнду памешчыцкіх корчмаў. Узнікала парадксальная сітуацыя – габрэйскія карчмары паілі шляхту, якая потым у стане алкагольнага ап'янення збівала і рабавала іх саміх і іх супляменікаў[135].

Падсумаванне. Такім чынам, крыніцы першай паловы XVI ст. дазваляюць больш поўна апісаць піцейны гандаль пры Жыгімонце I Старым. У перыяд яго праўлення продаж алкаголю знаходзіўся пад кантролем вялікага князя і падпарадкаванага яму мясцовага кіраўніцтва. У "залаты век" ВКЛ імклівыя змены да лепшага адбываліся і ў эканоміцы. Піцейны гандаль паспяхова развіваўся. Расла папулярнасць корчмаў, адбылося пашырэнне карчомных паслуг. Наведвальнікамі карчмы сталі прадстаўнікі ўсіх станаў. Гандаль напоямі аказаўся больш прыбытковым, чым продаж іншых тавараў у розніцу. Гэтым карыстаўся найперш вялікі князь, які ўзмацніў кантроль за паступленнем капшчызны, павялічыў арэндную плату за ўласныя корчмы, паколькі побач з мытнямі і зямлёй з'яўляліся яны важнай крыніцай вялікакняжскага багацця. Як і зямельная рэнта, корчмы давалі стабільны і надзейны прыбытак. Іх можна было закласці ў крэдытара, аддаць на кармленне дзяржаўным службоўцам або ў трыманне за пэўныя заслугі перад манархам. Узмацнілася раздача дазволаў на корчмы землеўладальнікам. Шляхта, якая губляла маёнткі, адчыняла шынкі ў гарадах[136]. Вышэйшае саслоўе адчула смак да карчомнага промыслу.

Удзел габрэяў у карчомным гандлі не быў пераважным. Іх абшчыны не вылучаліся яшчэ шматлюднасцю і канцэнтраваліся ў паўднёва-заходніх гарадах краіны. Гаспадара ВКЛ прывабліваліі найперш габрэі-адкупнікі піцейнага збору.

[131] АВАК. Т. XVII. № 167. 1540 г. С. 68–69; № 168. 1540 г. С. 69.

[132] Рэгесты. Т. 1. 1640 г. С. 378; 1647 г. С. 393.

[133] АВАК. Т. XVII. № 971. 1541 г. С. 394. Габрэі карчмары трымалі хрысціянскіх работнікаў, каб мець магчымасць вытрымаць святасць суботы (Шабат).

[134] РИБ. Т. XX. Литовская Метрика. № 107. 1514 г. С. 139.

[135] Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 67. С. 117–118.

[136] Не выпадкова ў Статуце 1566 г. было ўключана палажэнне аб пазбаўленні шляхецкай годнасці тых, хто займаўся шынкарствам. Гл.: Статут ВКЛ 1566. Раздзел III, п. 20.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Яны плацілі вялікую арэндную плату, маглі аддаць яе наперад, згаджаліся ўзяць выкуп у самых небяспечных і слабаасвоеных раёнах дзяржавы. У іх можна было ўзяць крэдыт пад залог капшчызны. Габрэі былі ініцыятарамі новых прыёмаў піцейнага гандлю. Аднак "сяброўства" з вялікім князем і яго адміністрацыяй траціла сваю безальтэрнатыўнасць. Пачаўся іх пераход на службу шляхты ў якасці арандатараў сельскіх корчмаў.

У часы праўлення Жыгімоната II Аўгуста (1544–1572)

Агульны стан

Жыгімонт II стаў вялікім князем Літоўскім у 1529 г., але да 1544 г. правіў сумесна з бацькам і натуральна, што не мог тады змяняць карчомную палітыку.

Павялічэнне колькасці корчмаў. У сярэдзіне XVI ст. узніклі спрыяльныя ўмовы для роста колькасці гаспадарскіх корчмаў. Паводле Уставы на валокі 1557 г., якая паклала пачатак аграрнай рэформы (пад назвай "валочная[137] памера"), адбывалася горадоў ад воласці ў якасці самастойнай адміністрацыйнай адзінкі[138]. У сувязі з гэтым намеснікі гаспадара мелі абавязак засноўваць па адной карчме на кожную воласць або вайтоўства. У вялікакняжацкіх дварах (маёнтках) працавалі півавары, мёдасыты, віннікі, якія выраблялі гарэлку ("віно гарэлае")[139]. Наладжваць корчмы больш, чым у адной вёсцы на воласць, забаранялася, каб не было "зладзейства". Калі нават лішнія корчмы стаялі на бойкім месцы і карчмары мелі на іх дазвол, вялікі князь патрабаваў зачыняць іх або далучаць да гаспадарскіх[140]. Праўда, такія абмежаванні наўрад ці выконваліся. Адміністрацыйная рэформа 1565–1566 гг. зрабіла падзел дзяржавы на воласці і паветы ўніверсальным[141], што спрыяла росту колькасці ваяводскіх і павятовых цэнтраў і колькаснаму павялічэнню ў іх корчмаў і шынкоў. У сярэдзіне XVI ст. яны мелі большы распаўсюд, чым гандлёвыя крамы[142]. Гэта адбывалася і коштам шляхецкіх кочмаў. У 1554 г., напрыклад, адпаведна інвентару Браслава, у ім на 117 дамоў прыходзілася 40 корчмаў[143].

Прэтэнзіі шляхты. З 1552 г. назіраўся рост колькасці шляхецкіх прашэнняў да гаспадара аб дазволе засноўваць корчмы ў маёнтках і мястэчках. Шляхта імкнулася здабыць выгаду з эканамічнага ажыўлення ў краіне[144]. У сярэдзіне

---

[137] Валока – мера зямлі, роўная 30 моргам або 21,36 га.

[138] Падзел адбываўся ў 1560 г. і адносіўся пераважна да Русі. Гл.: *Пичета, В.И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 445.

[139] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 98.

[140] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 204.

[141] Гл.: *Лаппо, И.И.* Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-Русский повет и его сеймики. Юрьев, 1911.

[142] РЕА. Т. 3. С. 31–32.

[143] *Копысский, З.Ю.* Социально-экономическое развитие гродов Белоруссии… С. 12.

[144] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 342.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

XVI ст. у дакументах віленскага сейма 1551 г. і гарадзенскага сейма 1558 г. фіксуюцца спробы шляхты дабіцца ў вялікага княза права на будаўніцтва і эксплуатацыю ў сваіх маёнтках корчмаў пры гасцінцах (бойкіх дарогах). Аднак, Жыгімонт Аўгуст не знайшоў слушных для таго падстаў і пакінуў старыя парадкі, калі шляхце дазваляліся корчмы "за особливую ласку и дазваленем" самога манарха[145]. Мясцовай шляхце не ўдалося зраўняцца ў правах з польскай шляхтай.

Вольныя корчмы "з ласкі гаспадара". Мяркуючы па прывілеях Жыгімонта Аўгуста, сабраных у Кнізе запісаў № 43 Метрыкі ВКЛ, ён быў больш шчодрым за бацьку ў выдачы дазволаў землеўладальнікам мець вольныя корчмы ў іх маёнтках. Толькі ў 1555–1558 гг. вялікі князь выдаў 13 прывілеяў на будаўніцтва корчмаў у маёнтках, размешчаных пераважна ў ваколіцах Вільні, з вызваленнем іх гаспадароў ад капшчызны "на вечныя часы" [146]. Удзельныя князі захоўвалі права засноўваць корчмы ў сваіх уладаннях пры ўзгадненні з вялікім князем[147]. Фактычна ўсе магнаты мелі пры Жыгімонце Аўгусце свае корчмы. Яны ўзгадваюцца ў інвентарах магнацкіх землеўладанняў. Цяжкасці ў заснаванні корчмаў мелі толькі прадстаўнікі дробнай і часткова сярэдняй шляхты, хоць дазвол гаспадара набываў усё больш фармальны характар. Пачынаючы з 1550-х гадоў, частай з'явай стала заснаванне прыватнаўласніцкіх мястэчкаў, гаспадары якіх адначасова атрымлівалі права і на вольныя корчмы[148]. Памешчыкі заходняй часткі ВКЛ лёгка дабіваліся дазволу на будаўніцтва вольных корчмаў у сваіх маёнтках пры гасцінцах. Яны атрымлівалі правы на вольныя корчмы як з уплатай капшчызны, так і з вызваленнем ад яе, як у спадчыннае ўладанне, так і на пэўны час. Для Жыгімонта Аўгуста таксама, як і для яго бацькі, было важным, каб вольныя корчмы яго шляхты стаялі ўдалечыні ад яго корчмаў і не шкодзілі прыбыткам скарбу[149]. Магчыма таму, што Жыгімонт Аўгуст не меў вотчын і корчмаў на Валыні, ён ахвотна раздаваў там правы на вольныя корчмы памешчыкам і духавенству

[145] РИБ. Т. XXX. Литовская метрика. № 5. 1551 г. С. 196; № 23. 1658 г., С. 477; *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 81.

[146] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 43 (1523–1560). Кніга запісаў № 43. (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. В.С. Мянжынскі. Мінск "Беларуская навука" 2003. № 14. 1555 г. С. 59; № 19. 1523. С. 63–65; № 21. 1556 г. с. 68–69; № 22. 1556 г. С. 69; № 23. 1556 г. С 69–70; № 27. 1556 г. С. 78–79; № 28. 1556 г. С. 79; № 29. 1556 г. С. 80; № 31. 1558 г. С. 81; № 32. 1557 г. С. 81082; № 34. 1557 г. С. 82–83; № 35. 1557 г. С.83; № 36. 1557 г. С. 83–84. Далей – Метрыка. Кніга № 43 (1523–1560).

[147] Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 54. С. 103; Metrika: knyga Nr. 25 (1387–1546). С. XXII. № 15. С. 83.

[148] Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 146. С. 186–187.

[149] Метрыка. Кніга № 43 (1523–1560). № 14. 1555 г. С. 59; № 19. 1523. С. 63–65; № 21. 1556 г. с. 68–69; № 22. 1556 г. С. 69; № 23. 1556 г. С 69–70; № 27. 1556 г. С. 78–79; № 28. 1556 г. С. 79; № 29. 1556 г. С. 80; № 31. 1558 г. С. 81; № 32. 1557 г. С. 81082; № 34. 1557 г. С. 82–83; № 35. 1557 г. С. 83; № 36. 1557 г. С. 83–84.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

напярэдадні Люблінскай уніі 1569 г. [150].Значыць, яшчэ да ўтварэння Рэчы Паспалітай магчымасці шляхты на заснаванне корчмаў істотна пашырыліся. Існавала толькі фармальнасць атрымаць дазвол ад вялікага князя.

Магчыма, што раздача вольных корчмаў служыла для Жыгімонта Аўгуста сродкам кампенсацыі тых страт, якія панесла шляхта ў выніку дакладнага ўліку і доказу сваіх правоў на зямлю, што выявілася ў ходзе аграранай рэформы[151]. Вялікі князь прыбіраў да сваіх рук зямлю, але не даацэньваў ролі піцейнага гандлю.

Шляхта, духавенства і габрэі такі гандаль адпаведна ацанілі. Землеўладальнікі, безумоўна, мелі вялікі поспех у авалоданні піцейным гандлем, што ўмацоўвала іх эканамічную вагу ў дзяржаве. Яшчэ да правядзення валочнай памеры 1557 г. сярод непахожых сялян землеўладальнікаў былі рамеснікі, якія займаліся вырабам алкагольных напояў. Гэта – півавары, мёдасыты, мёдавары, саладоўнікі[152]. Землеўладальная шляхта была гатовая цалкам забраць піцейны промысел у свае рукі, па прыкладу польскай.

Асаблівымі клопатамі вялікага князя былі агорнуты корчмы каталіцкага духавенства. Карчомныя прыбыткі плябаній былі недатыкальнымі. У Віцебску корчмы мясцовага плябана мусіў у 1556 г. арандаваць нават віцебскі ваявода[153].

Вольныя корчмы па-ранейшаму былі своеасаблівай платай за дзяржаўную службу[154]. Яны нават прыраўноўваліся да вайсковай зброі. У памежных замках ратмістрам пяхоты дазвалялася мець вольныя корчмы. Алкагольныя напоі ў замках прызначаліся для роты пехацінцаў і іх камандзіра – ротмістра, а таксама на продаж. Улады разлічвалі праз продаж "ротмістрскіх" напояў зберагчы сродкі падчас аплаты жаўнерам за службу. Праўда, у пачатку 1550-х гадоў вялікі князь пачаў абмяжоўваць правы ротмістраў. Спачатку ў Кіеўскім ваяводстве

---

[150] Lietuvos Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574) / užrašymų knyga 51 = Литовская Метрика: книга записей 51 / parengė A. Baliulis, A. Ragauskas ir R. Ragauskienė. № 15. С. 39; № 32. С. 54–55; № 65. С. 76–77; № 142. С. 199–200.

[151] Гл.: *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. Глава X. С. 285–357.

[152] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. С. 169–170.

[153] Литовская Метрика (1555–1558). 37–я книга судных дел. Вильнюс: Издательство Института истории Литвы 2010. № 9. 1556 г. С. 3.

[154] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 30 (1480–1546). Кніга запісаў канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. А.А.Мяцельскі. Мінск "Беларуская навука", 2008. № 89. С. 162; Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 46 (1562–1565). Кніга запісаў № 46. (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. В.С.Мянжынскі. Мінск "Беларуская энцыклапедыя" 2006. № 10. С. 162–163; Lietuvos Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574) / užrašymų knyga 51 = Литовская Метрика: книга записей 51 / parengė A. Baliulis, A. Ragauskas ir R. Ragauskienė. № 97. С. 125–126; Lietuvos metrika Kn. 37: (1552–1561); Užrašymų knyga 37/ Lithuanian Metrica: Book No. 37 Book of Inscriptions 37/ Parengė Darius Baronas. № 197. С. 249; Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 28 (1522–1552). Кніга запісаў № 28. (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. А.А.Мянжынскі. № 144. С. 183–184.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ён забараніў ім адкрываць корчмы за межамі замкаў, а ў замкавыя корчмы дапускаць гараджан і ўсіх старонніх[155]. Потым такая забарона была пашырана на замак у Мсціслаўі[156]. Пазней Жыгімонт Аўгуст узмацніў абмежаванні. У 1569 г. ротмістрам полацкага і іншых памежных замкаў забаранялася трымаць корчмы і шынкі. Вайскоўцы мусілі задаволіцца піўнымі, у якіх можна было захоўваць напоі толькі для сябе і пехацінцаў роты і то не для празмернага ўжывання[157]. Алкаголь аказаўся неэфектыўным у падняцці баявога духу абаронцаў ВКЛ ад маскоўскага агрэсара.

Водкупы. З сярэдзіны 1550-х гадоў Жыгімонт Аўгуст праводзіў палітыку павялічэння прыбыткаў казны для паспяховага адпору маскоўскім агрэсарам у ходзе Лівонскай вайны (1558–1583 гг.). Па прыкладу каралевы Боны ён уводзіў ў сваіх уладаннях правілы аб'ядноўваць піцейны збор не толькі з мытам, але з усімі іншымі пажыткамі ў гаспадарскіх адзінках. Гэта яшчэ больш прываблівала буйных адкупнікоў, а значыць, і павялічвала прыбытак вялікакняжацкіх гаспадарак[158]. Піцейны гандаль перастаў выдзяляцца ў асобную крыніцу даходаў.

Уласныя корчмы і піцейны збор з прыватных корчмаў Жыгімонт Аўгуст імкнуўся аддаваць на водкуп асабліва актыўна ў ходзе правядзення з 1557 г. аграрнай рэформы. Водкупы на піцейныя зборы фактычна азначалі ўвядзенне манаполіі гаспадара ВКЛ на продаж алкаголю ў межах пэўных адміністрацыйных адзінак і перадачу гэтай манаполіі адкупніку. Пераможцам ў тэндары на водкуп быў той, хто пагаджаўся плаціць большую арэндную плату. Праўда, мяшчане некаторых гарадоў, у тым ліку Гародні, дабіваліся для сябе выключнага права арэнды карчомнага збору з гараджан[159]. Дзеля забеспячэння манаполіі ўводзіліся абмежаванні з мэтаю прымусіць жыхароў манапольнага рэгіёна набываць напоі толькі ў корчмах арандатараў[160]. Толькі так адміністратыўным метадам можна было павялічыць прыбыткі арандатараў і гаспадара з продажу алкаголю. Водкупы ў вялікакняжацкім каштарысе пачалі выціскаць капшчызну.

Удзел адміністрацыі. Роля мясцовай адміністрацыі ў кантролі за паступленнем карчомных прыбыткаў у ходзе правядзення аграрнай рэформы ўзрасла. Значную частку збораў намеснікі мелі права браць для "пракармлення"[161].

---

[155] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 28 (1522–1552). Кніга запісаў № 28. (Копія канца XVI ст.) Падрыхтаваў к.г.н. А.А.Мянжынскі. № 113. С. 152–153; № 114. С. 154–155.

[156] Metrica. Kn. 37: (1552–1561). № 373. С. 355–356.

[157] Метрыка. Кніга № 42 (1556–1562). № 68. С. 87–88.

[158] Lietuvos Metrika: knyga Nr. 531 (1567–1569) / viešųjų reikalų knyga 9 = Литовская Метрика: книга публичных дел 9 / parengė L. Anužytė ir A. Baliulis, Vilnius: Žara, 2001. № 205. 1569 г. С. 187. Далей – Metrika: knyga Nr. 531 (1567–1569); *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 377.

[159] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 370.

[160] *Ён жа.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 384.

[161] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 150. 1558 г. С. 216; № 150. С. 216; № 479. С. 408.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Карчомныя грошы выкарыстоўваліся і на мясцовыя выдаткі[162]. Практыка, калі вялікакняжацкія намеснікі распараджаліся гаспадарскімі корчмамі і здавалі іх у арэнду, існавала пры Жыгімонце I у заходніх ваяводствах ВКЛ. Пры яго пераемніку яна пашырылася на ўсю дзяржаву. Такім чынам, сістэма фармавання мясцовых каштарысаў канчаткова склалася ў ВКЛ пры Жыгімонце Аўгусце[163]. Паколькі даход ад карчомнага гандлю быў часткай прыбытку мясцовай адміністрацыі, то яна разам з вялікім князем актыўна садзейнічала развіццю карчомнага гандлю і росту ў ВКЛ п'янства.

Ад манаполіі на продаж да манаполіі на вытворчасць. Рост попыту на піва і гарэлку выклікаў да жыцця неабходнасць масавай іх вытворчасці ў адасобленых броварах. Яны маглі заставаца і пры корчмах, але абслугоўвалі шырокае кола заказчыкаў. У канцы 1550-х гадоў выкарыстанне адасобленых ад корчмаў броварaў павялічылася, што якраз і сведчыла пра ўзнікненне масавай вытворчасці алкагольных напояў, якая ахапіла ўсю тэрыторыю ВКЛ[164]. Аддзяленне вытворчасці напояў ад гандлю імі і неабходнасць мець сродкі на вядзення вайны з войскам Івана Грознага выклікалі патрэбу ўвядзення падаткаабкладання гэтай вытворчасці і пашырэння на яе манаполіі вялікага князя. Пры ранейшым нераздзяленні гандлю і вырабу алкаголю, пераважна пры корчмах, такой неабходнасці не было.

Спачатку вялікі князь увёў манаполію на саладоўні і аддаваў іх на водкуп. Солад быў важным кампанентам піваварэння і вырабу гарэлкі, таму ўдзельнікі піцейнага гандлю траплялі ў залежнасць ад гаспадара ВКЛ або ад яго адкупнікоў саладоўняў. Пераход да манаполіі вытворчасці напояў адбываўся напрыканцы 1550-х гадоў. Павольна, бо папярэдне неабходна было пабудаваць бровары. Арандатарам, якія пагаджаліся іх будаваць, памяншалася арэндная плата за водкуп піцейнага збору. Толькі ў асобных выпадках бровары будаваліся коштам казны[165]. Манапалізацыя вытворчасці праводзілася пры ўдзеле намеснікаў і арандатараў. Паводле кантракта 1562 г. Жыгімонта Аўгуста з менскім старастам Васілём Тышковічам, ён атрымаў манапольнае права на вытворчасць напояў у Менску, а пабудаваныя ім бровар і саладоўня вярталіся ў скарб пасля яго смерці[166].

Толькі комплексная манаполія на бровары, сладоўні і млыны рэальна забяспечвала манаполію на вытворчасць алкагольных напояў, якая была ўведзена пераважна ў заходніх і паўднёва-заходніх староствах. Адначасова, рабіліся выключэнні для вырабу піцейнага мёду і піва для сямейных патрэб. Па назіраннях М. Доўнар-Запольскага, манапольныя бровары дзейнічалі толькі ў Літве, Падляшшы і ў Крэмянецкім старостве на Валыні. На Русі манапольных броварaў не

[162] Metrika: knyga Nr. 531 (1567–1569). № 205. 1569 г. С. 187.

[163] *Абрамчик, Л. Я.* Становление налогов и их развитие на территории Беларуси… С. 103, 105.

[164] Metrica. Kn. 37 (1552–1561). № 285. 1559 г. С. 296; *Гардзееў, Юры.* Магдэбургская Гародня. С. 45.

[165] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. С. 377.

[166] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга № 44 (1559–1566). Кніга запісаў № 44. Падрыхтаваў А.І.Груша. Мінск Арты-Фэкс, 2001. № 15. С. 19.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

было[167]. Меркаванне вядомага гісторыка пацвярджаецца і аналізаванымі да гэтага артыкула дакументамі[168]. Неабходна ўлічваць, што манаполіі на вытворчасць напояў падпарадкоўваліся толькі жыхары, якія аселі на землях, што належалі гарадской ратушы. Гараджане, якія пражывалі на прыватных землях (юрыздыках), былі вольнымі ад такой манаполіі[169]. Такім чынам, пры Жыгімонце Аўгусце манаполія на вытворчасць напояў не ажыццяўлялася ў поўнай меры. Яна ахапіла не ўсю краіну і тычылася пераважна толькі вырабу гарэлкі.

У парушэнне "даўніны" некаторыя намеснікі гаспадара забаранялі мець па хатах катлы для прыгатавання піва[170]. Забарона прыватных млыноў, саладоўняў, броварaў, корчмаў на вотчынных землях вялікага князя выклікала незадаволенасць дробнай шляхты і мяшчан. Калі гаспадар пачаў уводзіць манаполію на вытворчасць алкаголю, з розных бакоў паступалі просьбы, каб гаспадар не будаваў у гарадах саладовень і броварaў і дазваляў прыватным асобам па-ранейшаму карыстацца сваімі ўласнымі[171]. Вялікі князь ішоў часам на ўступкі толькі мяшчанам: пакідаў у арэндзе гарадоў саладоўні, бровары, корчмы (Слонім, Курэнец, Гародня, Браслаў) [172], перадаваў манаполію на вытворчасць і продаж алкаголю мяшчанам мястэчак, заснаваных гаспадаром[173].

У ходзе манапалізацыі продажу алкаголю кіраўніцтва ВКЛ імкнулася ўзяць пад кантроль і народны звычай, калі гарадскія і сельскія абшчыны ў пэўныя дні года (святы, кірмашы) выраблялі піва, мёд і супольна распівалі іх. Гэты народны пір называўся "складам" або з нямецкага – шротарствам. Ён не абкладваўся капшчызнай, аднак пазней пачаў абмяжоўвацца, бо трактаваўся ўжо як гандаль напоямі[174].

Да Люблінскай уніі 1569 г. склалася працэдура для аддачы на водкуп вялікакняскай манаполіі на выраб алкагольных напояў. Важнейшай яе рысай стала падпарадкаванне арэндатару саладоўняў, млыноў, вінакрняў, корчмаў, шынкоў, гэта значыць, усяго цыклу вырабу і раэалізацыі алкагольных напояў. А ў Карone, у адрозненне ад ВКЛ, з-за шляхецкага права прапінацыі пра манаполіі Жыгімонт Аўгуст не мог і марыць[175].

Падаткаабкладанне і прыбытковасць піцейнага гандлю. Важным этапам у пераходзе да падаткаабкладання вытворчасці алкаголю была валочная памера 1557 г., у ходзе якой наладжваўся ўлік гарадскіх дамоў і ўводзіўся піцейны збор

[167] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 386.
[168] Metrica. Kn. 37: (1552–1561). № 183. С. 235. № 184. С. 235– 236; № 373. С. 355–356; № 589. С. 470–471.
[169] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 381.
[170] *Ён жа.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 371.
[171] *Ён жа .* Дзяржаўная гаспадарка… С. 372.
[172] *Ён жа.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 388.
[173] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 21. С. 40–41.
[174] *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 372–373.
[175] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. С. 58.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

у памеры двух пенязяў нават з тых сядзіб, дзе не было корчмаў. У гэтым адлюстроўвалася спроба абкласці падаткам усіх, хто мог скарыстацца звычаем вольнага вырабу напояў для ўласнага спажывання[176]. Пазней, увядзенне манаполіі на вытворчасць напояў праводзілася мэтанакіравана дзеля падаткаабкладання прыватных асоб, якія выраблялі іх для ўласных патрэбаў.

Калі раней памер капшчызны шораз вызначаўся вялікім князем, то «Устава на валокі» 1557 г. зафіксавала яго адзіным для ўсяго ВКЛ (арт. 10): па паўкапе (30 грошай) на кожны напой. Паводле звестак па асобных гарадах, доля капшчызны ў дзяржаўным скарбе была невялікай[177], але ў 1569 г. у мястэчках гаспадары мядовай і піўной карчмы плацілі большую капшчызну (60 грошай), чым земляробы за арэнду валокі зямлі (42 грошы)[178]. Значыць, піцейны гандаль даваў усё ж добры прыбытак.

У 1561 г. у ходзе аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста ўводзіўся акцызны збор з корчмаў. Карчмары, якія гандлявалі півам і мёдам, плацілі гэты падатак па грошу, гандляры гарэлкай – па 2 грошы (больш толькі гандляры шаўковай тканінай – 4 грошы)[179]. Акцыз быў падаткам на спажыванне і ўводзіўся дзеля здабыцця дадатковых сродкаў на вайну. Яго мусілі плаціць усе карчмары і адкупнікі піцейнага збору. Больш высокі акцыз з гарэлкі рабіў яе даражэйшай за мёд і піва. Збор акцызу быў магчымым пераважна ў заходняй і сярэдняй частках ВКЛ[180].

У першы год Лівонскай вайны (1558) Жыгімонт Аўгуст прыняў пастанову аб падводнай павіннасці, якая ўскладалася на гандляроў і рамеснікаў. Кожны карчмар павінен быў плаціць ад продажу мёду і піва па аднаму грошу і ад продажу гарэлкі – па два грошы[181]. Больш прыбытковы гандаль гарэлкай, чым півам і мёдам, абкладваўся большым падаткам. Сейм 1561 г. увёў збор з памолу і з матэрыялаў для вырабу спіртных напояў[182]. Пацярпелым у вайне гарадам рабіліся ўступкі. Полацкія мяшчане мелі ад вялікіх князёў прывілей трымаць піўныя корчмы з вызваленнем ад капшчызны. Такой жа ільготы дабіліся і мяшчане Дзісны[183]. Ад капшчызны вызваляліся і жыхары наноў закладзеных у ходзе валочнай памеры гаспадарскіх мястэчак для прыцягнення новых перасяленцаў (Азёры, 1560 г.)[184].

---

[176] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 374.

[177] *Паздняковъ, Валерый*. Капшчына // Электронная энцыклапедыя „Вялікае Княства Літоўскае". Рэжым доступу: http://vkl.by/articles/1089

[178] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 193. С. 140.

[179] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства. С. 251.

[180] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 388–392.

[181] РИБ. Т. XXX. Литовская метрика. № 5. 1558 г. С. 593–594.

[182] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 264, 267.

[183] Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574). № 164. С. 226–229.

[184] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 329. С. 335.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Увядзенне падаткаабкладання вытворчасці алкаголю і яе манапалізацыя дазволіла вялікаму князю павялічыць свае прыбыткі. Рэформа піцейнага збору была часткай агульнадзяржаўных рэформ, скіраваных на павялічэнне прыбыткаў дзяржаўнага і гаспадарскага скарбаў[185]. Аднак, спрыяльнае для вялікакняжацкай казны становішча працягвалася нядоўга. Паводле пастановы Люблінска сойму 1569 г., капшчызна перастала збірацца з корчмаў на землях шляхты і духавенства. Прыбытак ад піцейнага гандлю перадаваўся ім, а падатак з піцейных установ, размешчаных на вялікакняжацкіх землях і ў гарадах стаў называцца чопавым зборам[186]. Дробная і сярэдняя шляхта ВКЛ дабілася ўрэшце праз унію раўнапраўя ў гэтым сэнсе са шляхтай Кароны.

Спажыўцы. Манаполія вялікага князя на продаж алкагольных напояў абмяжоўвала правы спажыўцоў. Яны маглі набываць гарэлку толькі ў корчмах і шынках вялікага князя або яго адкупнікоў[187]. Свабода хатняй вытворчасці піва і мёду для ўласнага карыстання захавалася на працягу ўсяго панавання дынастыі Ягелонаў[188]. Гэтым карысталіся як мяшчане, так і шляхта. Землеўладальнік Лукаш Куранецкі абавязваў сваіх прыгонных у Куранцах вырабляць для яго піва ў якасці падатка[189]. Аднак, хатні выраб піва быў для гараджан, якія не аралі зямлю, настолькі дарагім (набыццё ячменю, платы за выраб соладу, за бровар і млын), што гэта не прыносіла ніякай выгады[190]. Спажыўцам танней было набыць напой у арандатараў, чым вырабляць яго самім. Хоць звычайна падданыя вялікага князя, асабліва, хто вырошчваў сваё зерне, адказвалі на манапалізацыю вытворчасці і гандаль алкагольнымі напоямі, патаемным іх вырабам. Броварное піва было лепшым па якасці, чым хатняе, але маладаступным для сялян. Каб набыць у 1541 г. кварту піва (да 2 грошаў), селянін мусіў прадаць ягня (3 грошы)[191].

У сярэдзіне XVI ст. аматарамі адпачынку ў корчмах, як і раней, былі прадстаўнікі ўсіх саслоў'яў[192]. З павялічэннем колькасці гарэлачных корчмаў стала актуальным забеспячэнне гасцей закускай. На гэта звярталася ўвага у прывілеі Жыгімонта Августа 1546 г. свайму каморніку. Яму дазвалялася ва ўласным мястэчку Гінейцішкі "и мед, пиво, горелку и иншии речи стравъныи для гостей в корчме держати" [193]. У гарадскіх корчмах ВКЛ, як і ў Кароне, закусвалі хлебам, мясам, рыбай. У сельскіх корчмах, на вялікіх гасцінцах закуска была больш

[185] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 367; *Доўнар-Запольскі, М.* Сацыяльна-эканамічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI—XVII сталецьцях // Гістарычна-археолёгічны зборнік. № 1. Менск: Інбелкульт, 1927. С. 42.

[186] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 492–493.

[187] РЭА. Т. 2. С. 72.

[188] Тамсама. С. 373.

[189] *Сліж, Наталля.* Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя. С. 57

[190] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 381–382.

[191] Прыкладныя разлікі аўтара (Рэгесты. Т. 1. С. 191; Т. 2. С. 23; РЭА. Т . 1. С. 298).

[192] РЭА. Т. 2. С. 72.

[193] Метрыка. Кніга № 30 (1480–1546). № 89. С. 162.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

разнастайнай: карчомныя пасека і агарод забяспечвалі гасцей мёдам і гароднінай[194]. Асартымент напояў узбагачаўся. Мяшчане Менска мелі права гандляваць нямецкім півам і іншымі "чужымі" напоямі[195]. У кантракце 1565 г. утрымліваецца дазвол арандатарам берасцейскіх корчмаў гандляваць замежным віном (малмазыю, мушкатэлу) [196]. Але, як і ў Польскім каралеўстве[197], піва заставалася самым папулярным напоем ВКЛ. Алкаголь захоўваўся ў бочках розных памераў. Мёд кіслы (піцейны) можна было трымаць пасля адкрыцця бочкі толькі тры дні, інакш якасць яго гублялася[198]. Таму выраб піцейнага мёду праводзіўся пры корчмах. Там, дзе з-за нізкага попыту бочку піва хутка распрадаць было немагчыма, прадукт псаваўся. Гандляваць мёдам у розніцу было нявыгадна, таму пітны мёд і ўступаў месца піву і гарэлцы. У Кароне мёд быў дарагі, таму яго ўжывалі пераважна шляхта і заможныя мяшчане[199]. Піва пілі гарнцамі (2,8 л), квартамі (1,1), а гарэлку – келіхамі (120 гр). Самым танным напоем быў мёд, затым ішлі піва, гарэлка, віно.

Праблема п'янства. П'янства пры Жыгімонце Аўгусце было пашырана сярод гараджан і наёмных жаўнераў. Гарадскія корчмы былі адчнены практычна кругласутачна. На сойме 1551 г. шляхта прасіла вялікага князя забараніць прадаваць алкагольныя напоі ў гарадскіх корчмах па начах або абавязаць карчмароў, каб яны, калі ўжо не ў стане прыпыніць начную працу дзеля нажывы, не выпускалі наведвальнікаў на вуліцу да раніцы. Жыгімонт Аўгуст не падтрымаў прапанову шляхты і абавязаў іх загадваць сваім слугам, каб яны ноччу не выбівалі ў корчмах варотаў, акон, дзвярэй. На шляхту ўскладвалася адказнасць за гвалт іх слуг[200]. Пратэст пінскага войта супраць гандлю алкаголем ноччу (1563 г.) таксама не выклікаў рэакцыі[201].

На празмернае ўжыванне спіртных напояў абаронцамі гарадскіх замкаў вялікі князь усё ж вымушаны быў звярнуць увагу. У лісце да ротмістра Полацка (1569 г.) ён патрабуе памяркоўнага піцця, а менавіта, каб вайскоўцы не пілі з раніцы, а толькі ў абед і вечарам, а таксама і ў полудзень, у выпадку, калі каму піць захочыцца[202]. Гаспадар ВКЛ гэтым самым дэманструе дзіўнае разуменне памяркоўнага піцця. Відавочна, тады такія ўяўленні былі нормай. Вядома, што шлях-

[194] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C. 24–25.

[195] Метрыка. Кніга № 28 (1522–1552). № 144. С. 183–184.

[196] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 387.

[197] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. C. 79.

[198] Metrica. Kn. 37 (1552–1561). № 373. С. 355–356.

[199] *Radziewicz, Joanna.* Rola karczmy w życiu dawnej wsi polskiej. Рэжым доступа: http://rme.cbr.net.pl/index.php/archiwum-rme/377-marzec-kwiecie-nr-54/kultura-i-tradycje-ludowe40-7681/339-rola-karczmy-w-yciu-dawnej-wsi-polskiej

[200] РИБ. Т. XXX. Литовская метрика. № 4. 1551 г. С. 162–163, 172.

[201] Акты о евреях Т.29. № 2. 1563 г. С. XXXII. С. 3.

[202] М.В.Доўнар-Запольскі бачыць у гэтым толькі імкненне скарба абмежаваць прыватны выраб напояў і прыпыніць вольны ім гандаль. Гл.: *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 385.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

та піла піва замест вады ў час абеду і вячэры. Госцей яна запрашала ў 1560-х гг. не на келіх, а на бочку піва[203]. Хоць у факце ўжывання алкаголю з раніцы штодня адлюстравалася сведчанне пра існаванне ў той час сярод наёмнікаў арміі алкагольнай залежнасці, якую вялікі князь лічыў недапушчальнай для абаронцаў краіны. Хіба што, з раніцы вайскоўцы пілі піва слабой моцы, "апахмяляліся".

У сярэдзіне XVI ст. п'янства ўзрасло ў Еўропе паўсюль[204]. Пашыранасць гандлю алкагольнымі напоямі выклікала трывогу сучаснікаў Жыгімонта Аўгуста. Пасол ВКЛ у Крымскім ханстве Міхалон Літвін намаляваў у сваім трактаце "Аб норвах татар, літоўцаў і масквіцян" жудасны малюнак п'янства ў сваёй краіне, дзе алкаголь – гэты яд – пьюць усе: мужчыны, жанчыны і юнакі, на вуліцах і плошчах, а нават на дарогах[205]. Паслаўшы ў 1550 г. сваю працу да вялікага князя, аўтар хацеў, каб манарх прыпыніў зло ва ўмовах абвастрэння адносінаў з Маскоўскай дзяржавай. Як патрыёт сваёй краіны ён, зразумела, перабольшваў памеры п'янства[206].

Захапленне алкаголем у той час яшчэ не закранула вёску. Так, судовая справа 1541 г. – дакумент аб запазычаннасці – сведчыць, што на Гарадзеншчыне каралеўскі селянін Грыня Прахімовіч з братамі тры гады падрад бралі ў доўг на Спаса бочку мёду па 50 грошай. Выходзіць, што гэтага было дастаткова для трох сем'яў, каб выраблять піцейны мёд і ўжываць яго на працягу года[207]. Але вялікакняжацкія намеснікі ў мэтах павялічэння спажывання алкаголю, які папаўняў іх уласны і мясцовы каштарысы, былі зацікаўлены ў пашырэнні сеткі корчмаў і шынкоў у падпарадкаваных ім адміністрацыйных адзінках і пачалі паступова асвойваць сельскі рынак спажывання. У 1548 г. рагачоўскія валашчане (земляробы) скардзіліся Жыгімонту Аўгусту на рагачоўскага дзяржаўцу Паўла Пельжынскага. Сярод іншых злоўжыванняў ён пасылаў на сяло гарэлку і мёд ды і сам прывозіў іх з сабой, а потым гэты мёд піў разам са сваімі слугамі. Аплачваць іх піры павінны былі валашчане. Фактычна дзяржаўца не толькі сам піў і паіў сваіх слуг коштам сялян, але і гвалтам уцягваў іх у п'янства. Гаспадар, праўда, забараніў такую практыку рагачоўскаму дзяржаўцы[208]. Такі выпадак не быў адзіным. Гэта сведчыць, што пачалі спайваць сялан менавіта дзяржаўныя службоўцы.

---

[203] *Сліж, Наталля.* Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя. С. 60.

[204] *Бродэль, Фернан.* Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. С. 207.

[205] *Литвин, М.* [О нравах татар, литовцев и москвитян]. Отрывки 1–10./ Пер. К. Мельник. Предисл. и ред. В. Б. Антоновича // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Вып. I. Киев, 1890. С. 25–26; *Литвин, Михалон.* О нравах татар, литовцев и москвитян. М: МГУ. 1994.

[206] *Михалон Литвин.* О нравах татар, литовцев и москвитян. М: МГУ. 1994. Предисловие. С. 41–42.

[207] РЕА.Т. 1. С .287–288.

[208] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549). Užrašymų knyga 32, parengė Andrij Blanutsa, Dmitro Vashchuk, Darius Antanavičius, Eglė Deveikytė. № 12. С. 29 Далей – Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549). *Пичета В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. С. 135–136.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Трактат Міхалона Літвіна, відаць, зрабіў усё ж такі на Жігімонта II пэўнае ўражанне. Вялікі князь загадаў уладальнікам корчмаў, каб яны сачылі за парадкам: "ижъбы з оное корчмы их злодейства не множилися"[209], стрымліваў заснаванне корчмаў па вёсках, забараніў ротмістрам мець у замку агульнадаступныя корчмы і працягваў трымаць гарэлачныя корчмы пад кантролем сваіх намеснікаў. Мяшчанам забаранялася вырабляць гарэлку як на продаж, так і для сваіх патрэб, а таксама набываць яе ў іншых месцах, акрамя корчмаў арандатара[210]. Гэтыя забароны, безумоўна, у нейкай ступені стрымлівалі п'янства, аднак было відавочным, што яны адначасова служылі сродкам павялічэння прыбытковасці піцейнага гандлю. Урэшце, ужыванне гарэлкі не забаранялася. П'янства, на сам рэч, пашыралася на вёску, бо сам гаспадар заахвочваў ставіць новыя корчмы ва ўсіх валасцях, калі іх там не было, раздаваў дазволы на корчмы памешчыкам, а сваімі забаронамі толькі схіляў уласных падданых да патаемнага вырабу гарэлкі. Да таго ж прынятые меры тычыліся толькі гарадоў і валасцей, якія былі ў непасрэдным падпарадкаванні вялікага князя.

Удзел габрэяў

Габрэі-адкупнікі ў галіне піцейнага гандлю. Капшчызна заставалася практычна нязменнай велічынёй. Таму габрэі былі прыхільнікамі замены яе на водкупы як больш прыбытковыя для адкупнікоў і вялікага князя. Такая замена і была праведзена ў сярэдзіне XVI ст.

Буйныя габрэйскія адкупнікі былі зацікаўлены ў арэндзе піцейнага падатку ў адным пакеце з іншымі зборамі. У 1548 г. Жыгімонт Аўгуст аддаў у арэнду пінскім габрэям Ізраілю і Нахіму Песаховічам ды Юшку Машэевічу па іх просьбе ў арэнду пінскія мыты на год разам з піўнымі і мядовымі корчмамі і "іншыя пажыткі", якія да мытаў "здавна прыслухают" у Пінску, Клецку і Гарадку, а таксама пасялковыя корчмы. Адначасова арандатар атрымаў на водкуп воскабойню[211], зборы з гандлю і вагаў, пераправы ў Пінску і Гарадку за 75 коп грошай і 25 камянёў воску для вырабу свечак, якія шырока выкарыстоўваліся для асвятлення[212]. Ёсць шмат іншых прыкладаў комплекснай арэнды габрэямі гаспадар-

[209] Metrika: knyga Nr. 51 (1566–1574). № 37. С. 59; № 42. С. 64; № 60. С. 74; № 73. С. 82–83; № 80. С. 88;

[210] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 119. С. 93. № 197. С. 143–144; № 198. С. 144–145.

[211] Васкабойні і васкавы збор былі звязаны з "сычэннем" мёда, пабочным прадуктам якога быў воск, які ішоў на экспарт і выраб свечак. У1548 г. Жыгімонт Аўгуст прасіў свайго намесніка, каб ён не прадаваў воск з менскіх корчмаў, а прыслаў яго да Варшавы. Гл.: Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549). Užrašymų knyga 32, parengė Andrij Blanutsa, Dmitro Vashchuk, Darius Antanavičius, Eglė Deveikytė.Vilnius:LII leidykla, 2012. № 11. С. 26. Далей – Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549).

[212] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 49 (1566–1572). Užrašymų knyga 49 / Lithuanian Metrica: Book No. 49 (1566–1572). Book of Inscriptions 49 / Литовская Метрика. Книга № 49 (1566–1572). Книга записей 49. Parengė Eglė Deveikytė. Vilnius: LII leidykla, 2014. № 19. 1548 г. С. 34–35. Далей – Metrika. Knyga Nr. 49 (1566–1572). Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549). № 19. С. 34–35.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

скіх збораў у Пінску (Хаім Рубіновіч, 1558 г.)[213], Камянецку (Еска Шломіч, 1559 г.)[214], Мсціслаўлі (Еска Ўломіч, 1560 г.)[215], Крэмянецку (Якуб Феліксовіч, 1660 г.)[216], Шэрэшаве (Гошка Аграновіч і Езов Аврамовіч, 1661 г.)[217], Слоніме, Моўчадзі, Луконіцы (Самуэль Іудзіч, 1567)[218], Цікоціне (Абрам Ісаковіч, 1569) і Радашковічах (Абрам Якубавіч Длугач, 1569)[219], Пінску (Іцка Іойсіевіч, 1570 г.)[220].

Прадпрымальныя габрэі сумяшчалі арэнду корчмаў з іншым прадпрымальніцтвам, што давала магчымасць развіццё эканомікі. У 1569 г. берасцейскі габрэй Абрам Длугач яго сын Машэя ды кампаньён Шмойла Іляшэвіч арандавалі ў ваяводы Наваградскага Івана Гарнастая гаспадарскія корчмы, мыта і іншыя прыбыткі ў г. Радашковічы і плацілі за арэнду 200 коп як наяўнымі, так і таварамі (сукном і вострымі прыправамі)[221]. Таварны разлік прысутнічаў, відаць, не выпадкова. Акрамя водкупу, габрэйскія прадпрымальнікі займаліся аптовым гандлем. Даходы ад арэнды ішлі на арганізацыю гандлю, які дазваляў разлічвацца за арэнду. Карчомныя прыбыткі пускаліся і ў рост[222].

Паколькі корчмы былі толькі адным з элементаў гаспадарчага комплексу, то гэта вельмі істотна ўплывала на рост дарагавізны водкупаў. Яны таму ўсё больш станавіліся пад сілу толькі габрэйскім таварыствам. Неабходны для водкупу капітал складваўся нават з маленькіх узносаў кагальных габрэяў і, адпаведна, узносам дзяліўся прыбытак ад водкупу. Ініцыятарамі і юрыдычнымі прадстаўнікамі выступалі багатыя габрэі. Яны заключалі кантракт з прадстаўнікамі вялікага князя[223]. У сувязі з недахопам сродкаў, ростам арэндnай платы і пачаткам Лівонскай вайны, водкуп піцейнага гандлю габрэйскімі таварыствамі стаў асабліва актуальным. Напрыклад, у 1558 г. вялікі князь задаволіў просьбу нават вядомага і паспяховага адкупніка берасцейскага габрэя Хаіма Рабіновіча ўзяць у кампанію свайго таварыша для працягу арэнды пінскага мыта, карчмы і перавозу праз раку Прыпяць на тры гады[224].

Лівонская вайна не спрыяла піцейнаму промыслу габрэяў, асабліва ў зоне ваенных дзеянняў. Узраслі падаткі[225]. У 1570 г. берасцейскі габрэй Абрам Длугаш, арандатар радашкоўскіх корчмаў, пісаў Жыгімонту Аўгусту, што з прычыны

[213] Metrica. Kn. 37: (1552–1561). № 198. С. 249.
[214] Тамсама. № 285. С. 296.
[215] Тамсама. № 373. С. 355.
[216] Тамсама. № 473. С. 404–405.
[217] Тамсама. № 511. С. 427.
[218] PEA. T. 2. 1567 г. С. 194.
[219] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 45. С. 51–52; № 46. С. 52.
[220] Тамсама. № 197. С. 143–144.
[221] PEA. T. 2. С. 142, 217. Ва ўмовах вайны грошы станавіліся дэфіцытам і ў якасці сродкаў плацяжу зноў ужываліся тавары.
[222] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 147. С. 115–116.
[223] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 121.
[224] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 198. 1558 г. С. 149–151.
[225] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 599–602.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

вялікага голаду і спусташэння жаўнерамі мясцовага насельніцтва, ён не зможа ў бягучым годзе выплаціць арэндную суму цалкам, а таму прасіў зменшыць яе або прыпыніць арэнду. Гаспадар ВКЛ загадаў радашкоўскаму дзяржаўцу задаволіць просьбу габрэя аб памяншэнні арэнднай платы на адін год, а арэнду з ім прыпыніць толькі ў тым выпадку, калі ён адмовіцца плаціць поўную суму ў 1571 г. і знойдзецца арандатар, які дасць большую арэндную плату[226].

У час Лівонскай вайны салдаты рабавалі габрэйскія шынкі. У 1560 г. вайскоўцы роты Яна Збароўскага сілай забралі ў суражскага габрэя Шломы Каспяровіча грошы, вядро мёду, бочку піва, ялавіцы[227]. У сувязі з ваеннымі падзеямі (шкоды ад "люду служебного") і моравай пошасці Жыгімонт Аўгуст у 1569 г. пагадзіўся зменшыць арэндную плату берасцейскаму габрэю Якубу Агіловічу за магілёўскія корчмы і мыта[228]. У 1571 г. нават габрэі Вольф и Аврам Якубовічы, Якуб Ягеловіч адмовіліся ад арэнды магілёўскіх корчмаў, бо вайна і няўродзіца прынеслі ім адны страты, хоць арандатары і мелі ільготы: штогод плацілі не 1500 коп грошай, як у мірны час, а 1150 коп. Вялікі князь перадаў з 1572 г. арэнду магілёўскіх корчмаў, якія знаходзіліся ў горадзе ды ў валасцях і сёлах, васкабойню, вагавы збор і малыя паборы (акцыз) мытнікам ВКЛ Фронцку Станіслававічу і Себасцяну Місевічу на тры гады за ранейшую плату, але на пэўны тэрмін вызваліў іх ад яе ўзносу ў казну[229]. Габрэі, відаць, такой ільготы не дачакаліся[230].

Слугі адкупнікоў, як і самі адкупнікі браліся пад юрысдыкцыю вялікага князя[231]. Зразумела, што яны не сядзелі ў корчмах і шынках за прылаўкамі, а найчасцей карчмароў: габрэі – у тым ліку і хрысціян, каб не парушыць святасць суботы (Шабат), а хрысціяне – у тым ліку і габрэяў з надзеяй зрабіць корчмы больш прыбытковымі. Каб спаганяць піцейны падатак, адкупнікі выкарыстоўвалі, акрамя сваіх слуг, і ніжэйшых служачых мясцовай адміністрацыі. Вялікі князь, як правіла, загадваў сваім намеснікам усяляк садзейнічаць адкупнікам у зборы падаткаў.

Зацікаўленасць у дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць алкаголю. Увядзенне вялікакняжацкай манаполіі на саладоўні апрабіравалася на берасцейскіх габрэях. Са спасылкай на, нібыта, дрэннае піва, гаспадар даў у 1559 г. берасцейскім габрэям Якубу Агелевічу і Гешу Хаймовічу манапольнае права рабіць солад у Гародні, каб палепшыць якасць піва, і манаполію на продаж гэтага напою. Гарадзенскія мяшчане згубілі права рабіць солад дома або купляць яго дзесьці

[226] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 188. С. 137; № 194. С. 142.

[227] РЕА. Т. 2. С. 77. Магілёўскія корчмы знаходзіліся на водкупе ў габрэяў Аўрама Длугаша і Ескі Шломіча з 1561 г. (Рэгесты. Т. 1. С. 227–228).

[228] Metrika: knyga Nr. 531 (1567–1569). № 168. 1569 г. С. 160–161.

[229] Lietuvos Metrika Kn. Nr. 567: (1567–1571); Surašymų knyga 10 / parengė Algirdas Baliulis, Vilnius: Versus aureus, 2006. № 12. 1571 г. С. 46–47; № 14. 1571 г. С. 48–49.

[230] У 1552 г. вялікі князь не палічыў неабходным вызваліць берасцейскіх габрэяў ад капшчызны нават у сувязі з пажарам у горадзе. Гл.: Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 540. С. 440–441.

[231] *Бершадский, С.А.* Литовские евреи… С. 365.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ў іншым месцы. Яны маглі набываць яго толькі ў арандатараў[232]. У 1561 г. кантракт з Якубам Агелевічам і Гешай Хаймовічам быў прадоўжаны на тры гады з павялічэннем арэнднай платы з 150 да 200 коп грошай[233].

Даволі высокія патрабаванні да якасці соладу былі выкладзены ў спецыяльнай Берасцейскай уставе 1561 г., сфармуляванай на аснове кантракта з габрэйскімі адкупнікамі берасцейскіх саладовень[234]. Так, у адпаведнасці з ёй, гарадзенскія арандатары саладовень маглі рабіць солад для піва з пшаніцы, ячменю і жыта, але не змешваць іх. Цана на солад павінна была адпавядаць цане на збожжа, набытае на рынку ў панядзелак і не мяняцца на працягу тыдня. Вялікі князь дазваляў габрэям прадаваць бочку соладу на 3 грошы даражэй за гандлёвую цану. Прыбытак арандатара саладоўні ад продажу соладу складаў каля 30%, паколькі солад вырастаў, у параўнанні з зернем у сярэднім на 30%[235].

Габрэйскія прадпрымальнікі не маглі не ацаніць выгаду арэнды саладовень і ў іншых месцах. У 1560 г. кобрынскія саладоўні трапілі ў рукі мясцоваму габрэю Файбішу Есковічу на тры гады. Акрамя таго, Файбіш узяў у арэнду яшчэ бровары і саладоўні ў Дабучыне (зараз вёска ў Пружанскім раёне) таксама на тры гады[236] і тым павялічыў свой кантроль над вытворчасцю алкаголю. Патрабаванне да фіксаваных цэн на солад габрэйскія арандатары не заўсёды выконвалі. Кобрынскі габрэй Кайбіш і берасцейскі габрэй Песах Хаўковіч падвышалі цэны ў Дабучыне і м. Масты. Па скарзе мяшчан вялікі князь загадаў арандатарам саладовень прытрымлівацца берасцейскай уставы, але усё ж дазволіў і ім павялічыць гандлёвую цану бочкі соладу на 2 грошы[237].

Каб паскорыць увядзенне манаполіі на вытворчасць алкагольных напояў, габрэйскія адкупнікі прынялі ўдзел у будаўніцтве і рамонце броварaў. Пры прадаўжэнні ў 1557 г. арэнды гарэлачных корчмаў і млына ў горадзе Камянецкім на Валыні з габрэям Ескам Шломічам на тры гады за 140 коп штогод, яму былі аддадзены ў арэнду за 60 коп штогодна яшчэ бровары і саладоўні, якія неабходна было адрамантаваць або пабудаваць коштам арандатара. Шломіч атрымаў яшчэ і права малоць солад у вялікакняжацкім млыне без мерак (акцыза)[238]. У выніку ён мог кантраляваць у дадзеным горадзе вытворчасць гарэлкі. У 1558 г. Жыгімонт Аўгуст аддаў у арэнду слонімскаму габрэю Аўраму Малому ў Слоніме бровары і гарэлачны шынок на тры гады ўсяго за 30 коп грошай штогодна, аднак, арандатар павінен быў пабудаваць бровары сваім коштам. За тое будаўніцтва ён атрымаў манаполію на вытворчасць гарэлкі. Усе жыхары горада маглі варыць

[232] PEA. T. 2. C. 68; Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 221. C. 259.
[233] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 540. C. 440–441.
[234] Тамсама. № 439. C. 389.
[235] Тамсама. № 221. C. 259–260; *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 382.
[236] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 438. C. 388.
[237] Тамсама. № 547. C. 443; № 548. C. 444.
[238] Тамсама. № 285. C. 296.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

моцны напой толькі ў бровары арандатара, а за перагонку кожнай бочкі соладу ён браў па літоўскаму грошу[239].

У жніўні 1560 г. вялікі князь заключыў кантракт з гарадзенскім габрэем Песахам Хацкевічам аб пабудове ім уласным коштам у м. Масты саладоўні і бровара да студзеня наступнага года, пасля чаго Песах мог пачаць іх арэнду на працягу трох гадоў з платай па 16 коп штогодна. Пры гэтым указвалася, што арандатар павінен эксплуатаваць саладоўню і бровар гэтак жа, як берасцейскія габрэі, якія трымалі саладоўні і бровары ў Бярэсці[240].

У 1561 г. Жыгімонт Аўгуст аддаў у арэнду бровары ў Бельску, Нарэве, Кляшчэлях Ісаку Барадаўцу і Якубу Шчасновічу. Да гэтага часу яны арандавалі капшчызну, прыбытак з млыноў і саладоўні, але скардзіліся, што іншыя шкодзяць іх прыбыткам, бо самі яны броварaў не мелі. Вялікі князь улічыў іх просьбу і ўключыў у арэнду бровары з прычыны прадухілення "небеспечности от огня", якая зыходзіць ад броварaў "покутных" (патаемных), і дзеля памнажэння "пожитков скарбу нашого". У першы год арандатары павінны былі пабудаваць бровары і паставіць катлы, а таму вызваляліся ад арэнднай платы, а потым – плаціць па 60 коп за іх эксплуатацыю[241].

Вынікі ўвядзення манаполіі для габрэяў. Манаполія на вытворчасць алкаголю прывяла да зніжэння ролі габрэяў у вытворчасці і продажы сычанага мёду. Мядовы напой не губляў папулярнасці, але патрабаваў вялікіх выдаткаў для здабычы сыравіны. Кадка[242] мёду каштавала ў 1541 г. адну капу (60 грошай), а карова – паўкапы, цяля – каля 18 грошай[243]. Крыніцамі гэтай сыравіны служылі гаспадарскія бортні, мядовая даніна ішла ў казну. Для прыватнага мёдаварэння мёд збіраўся па вёсках у заможных гаспадароў габрэямі, якія абменьвалі яго на тканіну. З увядзеннем манаполіі на вытворчаць алкаголю, такая дзейнасць стала забараняцца. У 1558 г. па дарозе з Кузніцы да Гародні гаспадарскі дваранін Міклаў Татарчыч адабраў у габрэя Ісака Ізраілевіча прэсны мёд набыты развозным гандляром без ведама ўрада[244]. Ужыванне медавога напою скарачалася.

У той жа час у ходзе манапалізацыі вытворчасці алкаголю пашыраўся продаж гарэлкі. І ў сувязі з гэтым ўзрастала роля габрэяў у гандлі гэтым напоем, які прыносіў добры і надзейны прыбытак. Прыгатаванне гарэлкі было цяжкай рамеснай вытворчасцю і патрабавала пэўных навыкаў, якімі габрэі хутка авалодвалі. Вялікі князь да таго ж усяляк іх да гэтага заахвочваў. У асобных выпад-

[239] Тамсама. № 184. С. 235– 236.
[240] Тамсама. № 439. С. 389.
[241] Тамсама. № 589. С. 470–471.
[242] Кадка (бочка) умяшчала ад 0, 5 да 30 л мёду. У дадзеным выпадку аб'ём кадкі не ўказаны.
[243] Рэгесты. Т. 1. С. 182, 188. Магчыма выключэнне было зроблена ў сувязі з блізкасцю арэны ваенных дзеянняў.
[244] Рэгесты. Т. 1. С. 222, 512.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ках габрэі-адкупнікі атрымалі права засноўваць новыя корчмы па сёлах, на вотчынных землях вялікага князя[245].

У выніку ўвядзення манаполіі на вытворчасць алкаголю і аддзялення яе ад гандлю габрэі-карчмары згубілі права вырабляць алкагольныя напоі пры корчмах, размешчаных у падкантрольных вялікаму князю валасцях і гарадах. І з таго часу яны гандлявалі напоямі не ўласнай вытворчасці, а выраблёнымі на манапольных броварах вялікага князя. З удзельнікаў пашырэння алкаголю сярод спажыўцоў габрэі ператвараліся ў саўдзельнікаў разам з гаспадаром ВКЛ і яго адкупнікамі.

Паколькі жыхары юрыдык шляхты і духавенства былі вольнымі ад манаполіі, то габрэі, якія звычайна сяліліся на такіх юрыдыках, шчасліва пазбягалі падатку на вытворчасць напояў і маглі вольна вырабляць напоі пры шынках і корчмах, таму мелі перавагу над мяшчанамі-карчмарамі, што пражываўшыя на гарадскіх землях. Паколькі манаполія вытворчасці не ахапіла паўночна-ўсходнюю частку ВКЛ, то гэта служыла пэўным стымулам для габрэйскай каланізацыі гэтага рэгіёна. Ды і, як новая справа, арэнда пасялковых і памежных на ўсходзе краіны корчмаў трапляла да габрэяў[246].

Умовы на якіх габрэі бралі водкупы. Габрэі-адкупнікі дабіваліся поўнай перадачы ім манаполіі на продаж алкагольных напояў. У кантракце з крэмянецкімі габрэямі Леонам Іцхакавічам і Песахам Хаімовічам на арэнду гарэлачных корчмаў у Крэмянцы (1557 г.) вялікі князь уключыў патрабаванне да адміністрацыі садзейнічаць карчомнай дзейнасці арандатараў. За продаж прывазной гарэлкі ўстанаўліваўся штраф у 3 капы грошай на карысць вялікакняжацкага замка. Арандатарам дазвалялася вольна малоць на крэмянецкіх млынах у неабмежаванай колькасці жытні солад, з якога гоняць гарэлку[247]. Рэалізаваць жа манаполію габрэйскім адкупнікам было няпроста. У 1559 г. берасцейскі габрэй Мордух Шаховіч і шклоўскі габрэй Ісак Якубовіч скардзіліся на князя Івана Васільевіча Саламірэцкага, які здаў ім на 2 гады Мсціслаўскія, Радовальскія, Краснасельскія, Ропшскія корчмы (піўныя, мядовыя, гарэлачныя) і абавязаўся забараніць шляхце, мяшчанам і сялянам хадзіць у карчму ротмістраўскую, але абяцанне не выканаў – і яны панеслі страты больш за 200 коп[248].

Патрабаванні габрэяў да манапалізацыі гандлю ў іх руках асабліва ўзмацніліся ў гады Лівонскай вайны. У 1563 г. пінскі мытнік, габрэй Хем'я Рабіновіч, пратэставаў супраць пінскага войта Андрэя Івановіча, які на пінскім рынку заклікаў, каб усе карчмары па змроку і ў ночы прыпынялі сваю працу, і нават падаў на яго у суд. Мытнік спасылаўся на вялікую колькасць габрэйскіх шынкоў

[245] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 197. С. 143–144.
[246] Metrica: knyga Nr. 37. (1552–1561). № 183. 1558 г. С. 235.
[247] Тамсама. № 110. 1557 г. С. 190–191.
[248] РЕА. Т.2. С. 72. Князь нічога не губляў ад памяншэння прыбітковасці корчмаў, бо меў ад іх стабільны прыбытак, зафіксаваны ў арэнднай дамове. Страты неслі толькі арандатары.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

у Пінску, а таму лічыў, што іх закрыццё прынясе шкоду як самім карчмарам, так і дзяржаўнай казне. Пры судовым разбірацельстве войт апраўдваўся, што ён не супраць піва, хай п'юць, але іншыя напоі не трэба прадаваць, пакуль з горада не выйдуць жаўнеры, якія па начах "збродни, бой и зранения дают" [249]. У дамове аб арэндзе пінскіх корчмаў (гарадскіх і сельскіх) і пінскага мыта з берасцейскім габрэям Давыдам Шмерловічам (1565 г.) вялікі князь распарадзіўся штрафаваць тых, хто вырабляў і прадаваў напоі па-за яго корчмамі, а штраф дзяліць пароўну паміж пінскім замкам і арандатарам. За патаемна прывезеныя напоі ўстанаўліваўся штраф, паверх таго, у памеры 50 коп літоўскіх грошай на карысць замка. Каб прадухіліць контрабанду, вакол горада ўстанаўлівалася карчомная варта. У тым жа кантракце вялікі князь адмяніў раней выдадзеныя карчомныя ільготы мяшчанам і габрэям у Пінску і ў сёлах. Гаспадар спасылаўся пры гэтым на цяжкі стан скарбу ў сувязі з Лівонскай вайной. Набыць алкаголь можна было толькі ў корчмах арандатараў. У кантракце выяўляецца імкненне пашырыць манаполію на сельскую мясцоваць і пазбавіць права на вольныя корчмы тых, хто атрымаў іх з ласкі гаспадара. Продаж алкаголю быў поўнасцю манапалізаваны ў руках габрэйскага арандатара. Толькі варэнне піва, сычэванне мёду, а таксама – што было новым – курэнне гарэлкі для вяселляў і святаў заставаліся, паводле вялікакняжацкага загаду, па-ранейшаму вольнымі[250].

Для надзейнасці прыбыткаў Жыгімонт выдаў у 1569 г. свайму арандатару габрэю цікоцінскаму Абраму Вейсвеферу спецыльную ўставу, у якой былі распісаны тарыфы аплаты за солад і гарэлку, вырабленыя арандатарам і памеры іншых пабораў[251]. Такая рэгламентацыя была ўзаемавыгаднай. Вялікі князь папярэджваў злоўжыванні карчмароў, а яны мелі надзейна забяспечаны прыбытак і заўсёды маглі спаслацца на волю гаспадара.

Перадача вялікакняжацкай манаполіі на выраб алкагольных напояў перадавалася часцей габрэям-адкупнікам. У кантрактах яны дакладна агаворвалі свае правы і імкнуліся максімальна забяспечыць для сябе манаполію на вытворчасць напояў. Яскравым прыкладам таму можа быць кантракт Жыгімонта Аўгуста з мсцібагаўскім габрэем Ізраэлем Бірмановічам і берасцейскім габрэем Якубам Зіскіндовічам, заключаны ў канцы 1569 г. Паводле гэтага кантракта, арэнда волпенскіх малых пабораў (акцызу) у горадзе і вёсках працягвалася на два гады. Арандатараў вялікі князь абавязваў па-першае, своечасова ўносіць арэндную плату пад пагрозай страты арэнды і кампенсацыі страт уладальніка і, па-другое, не чыніць ніякіх цяжкасцяў для падданых караля. Падданыя, у сваю чаргу, паводле распараджэння вялікага князя, не мелі права рабіць солад, а павінны былі набываць яго толькі ў арандатара, малоць солад і збожжа толькі на вялікакня-

[249] Акты о евреях Т. XXIX. № 2. 1563 г. С. XXXII. С. 3.
[250] РЕА. Т. 2. С. 194; *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 385.
[251] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 206. С. 150.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

жацкіх млынах, а з купленага ў арандатараў соладу варыць піва і мёд толькі на вялікакняжацкіх броварах[252].

Такой жа жорсткай рэгламентацыяй вылучаецца і пагадненне 1570 г. Жыгімонта Аўгуста з габрэем Іцкам Майсіевічам на арэнду вялікакняжацкіх прыбыткаў у Пінскім ваяводстве (у тым ліку ад гарадскіх корчмаў у Пінску, Нобелі, Пагосце, Моталі і ад пасялковых) на тры гады. У Пінску ўсім іншым забаранялася мець корчмы, акрамя дзвюх дадзеных з ласкі гаспадара. Напоі можна было набываць толькі ў арандатара. Прывазны алкаголь забаранялася нават трымаць у хатах для ўласных патрэбаў з пагрозай штрафу[253].

Канкурэнцыя паміж габрэямі. Набыццё ў караля манапольнага права на продаж напояў у пэўных паселішчах не выключала канкурэнцыю, якая яскрава выявілася ў сярэдзіне XVI ст. У ходзе аграрнай рэформы, пачатай у 1557 г., колькасць габрэйскіх адкупнікоў узрастала. Яны спаборнічалі паміж сабой за права арэнды карчомных прыбыткаў гаспадара. Калі ў 1557 г. у крэмянецкіх габрэяў Машэя, Якуша Давідовічаў і Ескі Хексіорвіча скончылася арэнда гаспадарскай гарэлачнай карчымы ў іх горадзе, гэтую арэнду перахапілі іх супляменнікі Леон Іцхаковіч і Песах Хаімовіч, якія прапанавалі больш высокую арэндную плату. Жыгімонт Аўгуст перадаў ім у арэнду гарэлачныя корчмы ў Крэмянцы на тры гады. Ён уключыў у дамову з арандатарамі патрабаванне да сваёй адміністрацыі сачыць, каб ім не шкодзілі мясцовыя святары, якія, відаць, непрыхільна глядзелі на габрэйскіх карчмароў, таму што мелі ўласныя корчмы[254]. Такі ж факт канкурэнцыі зафіксаваны ў кантракце 1558 г. на арэнду мыта, карчмы і перавозу ў Пінску, калі ў габрэяў Ізраіля і Нахіма Песаховічаў наём пераняў буйны адкупнік берасцейскі габрэй Хаім Рубіновіч, павялічыўшы арэндную плату за тры гады з 250 да 300 коп грошай[255].

Канкурэнцыя паміж габрэямі і негабрэямі. Да сярэдзіны XVI ст. узрасла напружанасць у адносінах хрысціян і габрэяў у сувязі з іх эканамічнай дзейнасцю. У вярхах грамадства фармаваўся адмоўны вобраз гандляра і, увогуле, габрэя. Міхалон Літвін, посол ВКЛ у Крымскім ханстве, мемуарыст-этнограф XVI ст., у сваім творы "О правах татар, литовцев и масквитян" адгукнуўся пра эканамічную ролю габрэяў вельмі негатыўна: "…Народ вераломны, хітры, шкодны, які псуе тавары, падрабляе грошы, подпісы, пячаткі, на ўсіх рынках адымае ў хрысціян сродкі да жыцця, не ведае іншага майстэрства, акрамя падману і паклёпу…"[256].

[252] Тамсама. № 119. С. 93. І гэты выпадак толькі пацвярджае вышэй адзначаную выснову М.Доўнар-Запольскага пра невыгаднасць вырабу піва і гарэлкі ў хатніх умовах пры ўвядзенні вялікакнязкай манаполіі на выраб гэтых напояў.

[253] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 367.

[254] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 110. С. 190–191.

[255] Тамсама. № 198. С. 249–250.

[256] Рэгесты. Т. 1. С. 201. Сваімі негатыўнымі характарыстыкамі ВКЛ ён аўтарпадштурхоўваў Жыгімонта Аўгуста да больш радыкальных рэформаў у ВКЛ.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Тагачасныя дакументы таксама адлюстроўваюць варожыя адносіны да габрэяў-карчмароў з боку святароў і мяшчан, якія трымалі корчмы[257]. У адзначаным голадам 1551 годзе шляхта скардзілася вялікаму князю, што габрэі захапілі ў свае рукі немалыя куплі і водкупы мытаў і корчмаў[258]. Напружанасць у адносінах мяшчан-хрысціян і іудзеяў выяўлялася найперш у вялікіх гарадах. Берасцейскі падстараста мусіў выдаць у 1558 г. мясцовым габрэям ахоўны ліст. Яны скардзіліся, што бурмістр, райцы, увесь магістрат, падахвочаныя нейкай злосцю, пагражаюць пры садзеянні іншых асоб іх здароўю, нападаюць на дамы і маёмасць[259]. Каб нейтралізаваць магчымы канфлікт з мяшчанамі, Жыгімонт Аўгуст разам са сваімі адкупнікамі-габрэямі ішоў на кампраміс. У кантракце вялікага князя 1560 г. з габрэем Ескам Шломічам на арэнду гаспадарскіх падаткаў у Мсціслаўлі было ўказана на неабходнасць захавання традыцыі сыціць "папамі" мёд, а далей дакладна вызначалася калі і колькі пудоў мёду маглі сыціць мсціслаўскія святары. Пры парушэнні гэтай умовы ён канфіскоўваўся на карысць арандатара[260].

Аднак, канкурэнтная барацьба паміж габрэямі і мяшчанамі за спажывецкі рынак алкаголю нарастала. Аддача каралём у 1561 г. піваварэння ў Гародні ў манапольную арэнду яўрэям выклікала незадаволенасць мяшчан[261]. У 1562 г. Себасцян Падстрыгач скардзіўся на гарадзенскага габрэя Іцку Мошчычы, які, нібыта, прадаваў "дурны мёд", але на суд заявіцель не прыйшоў[262]. Хутчэй за ўсё, дакумент зафіксаваў адзін з прыёмаў канкурэнцыі, хоць гэта не азначала, што ў продажы не сустракаліся фальсіфікаваныя напоі. Карчмар-хрысціянін з Крынак скардзіўся ў 1562 г. на бездаходнасць сваёй карчмы, а прычынай таму было, на яго думку, тое, што саладоўні знаходзіліся там у арэндзе габрэяў[263].

Каб захапіць водкуп, габрэі набаўлялі арэндную плату. У 1564 г. вялікі князь паведамляў земскаму падскарбію Астафію Валовічу аб аддачы збораў з раздробленага продажу гарэлкі і піва, сычэння мёду, вырабу соладу і яго памолу ў Пінску і ў мястэчках "пробошчеўскіх" (Бездежу, Матолі і Ноблі) пінскім габрэям Васку Медзенчэчу і Гершону Аўрамовічу. Раней арандатарамі выступала чацьвёра пінскіх мяшчан, якія плацілі па 200 коп грошай у год. Аднак, габрэі прапанавалі Жыгімонту Аўгусту гадавую плату на 20 коп болей[264].

Рабіліся спробы неяк супакоіць адносіны габрэяў і хрысціян у сферы піцейнага гандлю. На гарадзенскім сойме 1568 г. дэпутаты ад г. Вільні прасілі Жыгімонта Аўгуста распаўсюдзіць гарадскія подаці на ўсіх гандляроў, у тым ліку і габрэйскіх шынкароў, бо габрэі не падлягалі юрысдыкцыі магістрата і вызваляліся ад гарад-

[257] Рэгесты. Т. 1. С. 203.
[258] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 119.
[259] Рэгесты. Т. 1. С. 484.
[260] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 373. С. 355–356.
[261] РЕА. Т. 2. С. 89.
[262] РЕА. Т. 2. С. 112.
[263] Метрыка. Кніга № 42 (1556–1562). № 102. С. 118–119.
[264] РЕА. Т. 2. С. 134–135.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

скіх збораў, а гэта давала ім перавагу над мяшчанамі ў продажы алкагольных напояў[265]. Пінскія габрэі скардзіліся ў 1569 г. вялікаму князю, што мяшчане парушаюць дамоўленасць аб праве габрэяў на траціну арэнды корчмаў. Мяшчане, у саю чаргу, абвінавачвалі габрэяў, што яны перакрываюць гэтую норму іх коштам, бо пашырылі сетку вытворчасці і продажу, набудавалі незлічоную колькасць корчмаў ды яшчэ ўхіляюцца ад подацей, цяжар якіх кладзецца на мяшчан[266]. У 1569 г. разгарэўся канфлікт паміж арандатарам вяліканязжацкіх прыбыткаў крэмянецкім габрэем Майрам Мосіевічам і войтам Крэмянца Федарам Навасельскім, які сам вырабляў і прадаваў алкагольныя напоі і тым парушаў манаполію арандатара на выраб соладу, выраб і продаж алкагольных напояў. Жыгімонт Аўгуст загадаў войту праз старасту крэмянецкага прытрымлівацца даўніны. Акрамя таго, вялікі князь устанавіў тарыфы для арандатара, а можа пацвердзіў прапанаваныя ім: прадаваць солад па 15 грошай з бочкі, браць броварнае за вар піва 7 грошай і за вар гарэлкі 5 грошай[267]. Атрымлівалася так, што мяшчане і магістрат не цярпелі габрэя Мосіевіча, бо ён уводзіў строгія меры ўліку.

Габрэі, як і не габрэі, адкупнікі вялікага князя, у пагоні за прыбыткам часам павялічвалі са згоды гаспадара падаткі на піцейны гандаль. Тады пратэсты супраць вялікакняжацкіх адкупнікоў-габрэяў набывалі сацыяльны змест. У 1569 г. гараджане Бельска, Нарвы, Бранска, Суража, Кляшелеў, Мельніка, Тыкоціна, Кнышына, Солец у адказ на павялічэнне падаткаў адмовіліся іх плаціць. У лісце да мяшчан Бельска Жыгімонт Аўгуст асуджаў іх за адмову ад пабораў з шынкоў, куплі соладу і гарэлкі і за пагрозы арнадатарам гаспадарскім габрэям Ісаку Бародаўцы і Якубу Шчасновічу. Каб прыпыніць страту сваіх прыбыткаў, вялікі князь паслаў у Бельск свайго каморніка з мэтай вышуку вінаватых, пакарання іх і ўзнаўлення пабораў. У той жа час Жыгімонт II пайшоў на ледзь бачны кампраміс – загадаў паменшыць плату за солад на 1 польскі грош[268].

Калі ў польскіх гарадах карчмары цярпелі ад канкурэнцыі вясковых вытворцаў алкаголю, бо вольныя ад падаткаў, памешчыкі прывозілі на гарадскі рынак больш танныя напоі[269], то ў ВКЛ канкурэнцыі паміж вясковымі і гарадскімі корчмамі не існавала. Памешчыкі практычна адсутнічалі на гарадскім рынку спажывання спіртных напіткаў.

Намеснікі караля ў 1570 г. стараліся звесці на мінімум вялікакняжацкую ільготу мяшчанам Аўгустова манапольна вырабляць і прадаваць алкаголь[270]. Гэта адзін з фактаў, які сведчыць, што на гарадскім рынку напояў вялікакняжацкая адміністрацыя магла шкодзіць мяшчанам. Урэшце, новая манаполія на вытворчасць алкаголю стала прывабнай як для заможных мяшчан і габрэяў, так

[265] РИБ. Т. XXX. Литовская метрика. № 24. 1568 г. С. 481, 487, 515.
[266] Акты о евреях Т.29. № 16. 1669 г. С 19–20.
[267] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 15. С. 35–36; № 17. С. 36–37; № 18. С. 38.
[268] Тамсама. № 118. С. 92.
[269] *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. С. 58.
[270] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 21. С. 40–41.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

і для адміністрацыі, што парадзіла паміж імі канкурэнцыю за водкупы на выраб найперш гарэлкі.

Прычыны паспяховасці габрэяў. У канкурэнцыі з габрэямі мяшчане-хрысціяне, звычайна прайгравалі, асабліва, калі карчма даставалася неспрактыкаваным гаспадарам. У 1520-х гадах зафіксаваны выпадак, калі пасля смерці гаспадарскага повара, які атрымаў карчму за службу, яго сын не змог працягнуць справу бацькі і са згоды Жыгімонта I прадаў вялікакняжацкую карчму ашмянскаму баярыну[271]. Абрусны Мікалай Карповіч, які накрываў на стол Жыгімонта Аўгуста, не змог у 1562 г выплаціць надзвычайны пабор з гараджан. Ён тлумачыў гэта тым, што яго карчма ў Вільні не давала прыбытак з-за канкурэнцыі з боку арандатараў-габрэяў[272].

Мацей Любаўскі тлумачыў поспехі габрэяў іх незвычайнай жвавасцю, спрытам, энергіяй, уменнем збіраць капітал і пускаць яго ў абарот. На яго думку, мяшчане-гандляры не вылучаліся такімі якасцямі, бо прадпрымальніцтва было для іх прыдаткам да земляробства. Нават багатыя мяшчане аддавалі перавагу набыццю маёнткаў. Прывязаныя да зямлі, яны, як і ўвогуле земляробчы клас, заставаліся ў нерухомасці і коснасці. Мясцовыя корчмы, прыбытковасць якіх была вядома, яны яшчэ бралі ў арэнду, бо гэта не адрывала іх ад дому. Аднак кідаць сваю гаспадарку, каб арандаваць корчмы ў далечыні, на вялікіх гасцінцах, мяшчане адважваліся рэдка. Для іх гэта абазначала мяняць надзейную справу на няпэўную. Такія корчмы даставаліся габрэям. Да таго ж габрэі, звычайна, апяраджалі мяшчан падчас водкупу праз надбаўкі да арэнднай цаны, якую прапаноўвалі мяшчане. Часам яны былі гатовыя ўнесці частку арэнднай сумы наперад, а свае абавязкі перад казной выконвалі дакладна і добрасумленна, бо ад гэтага залежыў і прыбытак іх саміх як арандатараў[273]. Не менш важна для піцейнага гандлю было і тое, што габрэі вялі цвярозы вобраз жыцця, былі камунікабельнымі, прыязнымі, умелі ўсім дагадзіць. Таму Жыгімонт Аўгуст быў зацікаўлены ў габрэях-адкупніках.

Хоць у піцейным гандлі гаспадар і спрыяў мяшчанам (чаго нельга сказаць пра габрэяў), прагматычны інтарэс прымушаў яго мець справу з габрэямі. Яны прываблівалі Жыгімунта Аўгуста сваім уменнем павялічваць прыбыткі казны нават ва ўмовах вайны. Як сведчыць ліст вялікага князя ад 8 студзеня 1570 г., адкупніком у Крынках спачатку быў гарадзенскі габрэй Нахім Сарэвіч, потым гаспадарскі служэбнік Якуб Грамацкі, але, жадаючы павялічыць даходы, Жыгімонт Аўгуст перадаў арэнду берасцейскаму габрэю Іцку[274]. У вялікага князя была магчымасць параўнаць дзейнасць хрысціянскага і габрэйскага арандатараў, каб зрабіць свой выбар на карысць габрэя. Бліжэй да Люблінскай уніі на вялікак-

[271] Metrika: knyga Nr. 12 (1522–1529). № 55. С. 153.
[272] *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа… С. 399.
[273] *Любавский, М.К.* Очерк истории Литовско-Русского государства… С. 119–120.
[274] Metrika: knyga Nr. 52 (1569–1570). № 199. С. 145–146.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

няжацкіх намеснікаў ускладаўся абавязак знаходзіць сярод габрэяў арандатараў і заключаць з імі пагадненні. Пры гэтым арэндная плата пры перазаключэнні дамоў з габрэйскімі адкупнікамі часам узвышалася з 300 да 800 злотых штогодна[275]. Габрэі-адкупнікі строга сачылі за шынкарамі, якія павінны былі непасрэдна ім уносіць "шынковы пабор" [276]. Важна было і тое, што габрэі згаджаліся арандаваць корчмы на паўночным усходзе дзяржавы, дзе водкуп стаў небяспечным[277].

Вялікі князь імкнуўся здаць у арэнду габрэям найперш гарэлачныя бровары і корчмы "для лепшага пажытку скарбу нашага"[278]. У 1558 г. гаспадар ВКЛ аддаў у арэнду слонімскаму габрэю Аўраму Маламу бровар і гарэлачны шынок ў г. Слоніме на тры гады[279]. У лісце Жыгімонта Аўгуста 1559 г. да берасцейскага габрэя Ескі Шломіча гаворка ішла аб аддачы яму ў арэнду млына, гарэлачных корчмаў, бровара і саладоўні ў Камянецкім з правам малоць бясплатна ўласнае зерне[280].

Эканамічны антысемітызм. Няўдачы ў эканамічным спаборніцтве штурхалі мяшчан да гвалту. У дакуменце 1561 г. зафіксаваны разбой з боку святароў Луцка. Незадаволеныя габрэйскімі арандатарамі піцейных дамоў, яны сарвалі пячаткі і зламалі замкі на дамах, дзе быў карчомны выраб напояў[281]. У тым жа 1561 г. Жыгімонт Аўгуст, як ужо адзначалася вышэй, даў берасцейскім габрэям Ісаку Барадаўку і Якубу Длугачу выключнае права на продаж і выраб алкагольных напояў у Бельску, Нарэве, Кляшчэлях. Пашырэнне правоў адкупнікоў раззлавала мяшчан. На глебе канкурэнцыі ў Бельску ўзнікла "рытуальная" справа Берната Абрамовіча, прыказчыка Брадаўкі. Мясцовыя мяшчане ўнеслі супраць яго абвінавачванне ў забойстве хрысціянскай дзяўчынкі з Нарава. Нявіннага прымусілі пад катаваннем прызнаць віну і пакаралі смерцю, хоць на судзе ён адмовіўся ад прызнання, вырванага праз гвалт[282]. Эканамічная канкурэнцыя перарастала ў эканамічны антысемітызм гараджан хрысціянскай веры якраз у галіне гандлю спіртнымі напоямі.

Падсумаванне. Такім чынам, у перыяд праўлення Жыгімонта II Аўгуста назіраўся значны рост колькасці корчмаў і развіццё піцейнага гандлю. Ён даваў значны прыбытак. Напрацаваны ў гэтым гандлі капітал выкарыстоўваўся для эканамічнага развіцця гарадоў і памешчыцкіх гаспадарак, ажыўляў эканоміку ВКЛ. Пра тое можа сведчыць факт адмовы вылучаць карчомны гандаль у асобны артыкул вялікакняжацкага каштарыса, бо карчомны прыбытак абрастаў прыбыткамі ад іншых галін прадпрымальніцтва.

[275] Тамсама. № 45. С. 51–52; № 46. С. 52. Адна капа адпавядала двум злотым.
[276] РЕА. Т.2. 1567 г. С. 194.
[277] Metrica. Kn. 37. (1552–1561). № 183. С. 235.
[278] Тамсама. № 184. 1558 г. С. 235.
[279] Тамсама.
[280] Тамсама. № 285. 1559 г. С. 296.
[281] Рэгесты. Т. 1. С. 228.
[282] *Иоффе, Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. Краткий научно-популярный очерк. Минск 1997. С. 19–20.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Канкурэнцыя на рынку спажывання алкагольных напояў абвастралася. Вялікі князь паступова губляў свае манапольныя пазіцыі. Пад напорам шляхты і ваенных абставін выдача ім дазволаў на вольныя корчмы землеўладальнікам набыла масавы характар. Шляхта з рыцарскага стану трансфармавалася ў стан сельскага гаспадара[283]. Для ўтрымання сваіх пазіцый на піцейным рынку Жыгімонт Аўгуст рабіў стаўку на больш знаходлівых і надзейных карчмароў-габрэяў. Мяшчане атрымлівалі ад манарха ільготы, а габрэі – канкрэтную справу для павялічэння прыбыткаў ад піцейнага гандлю, бо ўмелі гэта добра рабіць. Габрэі як асобнае саслоўе ВКЛ не мелі, у адрозненне ад мяшчанства, у піцейным гандлі ніякіх эканамічных ільгот ды і не выпрошвалі іх. Яны дзейнічалі. Менавіта габрэі падтрымалі, а можа і прапанавалі, увядзенне вялікім князем манаполіі не толькі на продаж, але і на выраб алкагольных напояў. Толькі такім чынам можна было больш эфектыўна змагацца з "пакутнымі" корчмамі і павысіць прыбытковасць піцейнага гандлю. Аднак слабасць вялікакняжацкай улады, існаванне ў дзяржаве двух сектараў – агульнадзяржаўнай і ўласна вялікакняжацкай эканомікі[284] – не дазволілі гэты праект ажыццявіць цалкам. Габрэі спрыялі замене капшчызны на водкупы. Яны вельмі паслядоўна рэалізоўвалі атрыманае ад гаспадара ў арэнду манапольнае права на выраб і продаж напояў шляхам строгага ўліку і кантролю за яго вытворчасцю і гандлем. Габрэі дэманстравалі новыя прыёмы водкупу піцейнага збору. Кагал выступаў у якасці своеасаблівага акцыянернага таварыства дзеля здабычы водкупаў на збор вялікакняжацкіх прыбыткаў. Магдэбурыі атрымлівалі права на манаполію вытворчасці і продажу напояў з ласкі гаспадара, але на гэтым нажывалася толькі гарадская бюракратыя. Габрэі прытрымліваліся рынкавых метадаў. Мяшчане задавальняліся адміністрацыйнымі.

Саюз габрэяў з вялікім князем аказаўся недаўгавечным. Яго пазіцыя ў адносінах да асноўных габрэйскіх канкурэнтаў – мяшчан – была не акрэсленай і часам мела проста дабрачынны харкатар, што не магло падабацца габрэям. Шляхта ж бачыла ў габрэях саюзнікаў у барацьбе за выцясненне мяшчан з гарадскога рынку збыту алкагольных напояў. Таму габрэі-карчмары пачалі пераходзіць на службу шляхце, але пакуль стараліся быць карыснымі як для вялікага князя, так і для буйнай шляхты.

Удзел іудзеяў у піцейным гандлі ўзрастаў. З гарадскіх цэнтраў яны пашырылі сваю дзейнасць на дробныя гарадскія паселішчы, вёскі і на ўсходнія раёны ВКЛ і істотна ўмацавалі свае пазіцыі ў заходніх раёнах краіны. Гэта параджала вострую незадаволенасць і нават эканамічны антысемітызм сярод мяшчан.

П'янства ахапіла мяшчан, наёмных жаўнераў і часткова шляхту. Вялікі князь пашыраў гандаль гарэлкай з дапамогай сваіх намеснікаў і габрэяў-адкуп-

[283] *Доўнар-Запольскі, М. В.*Дзяржаўная гаспадарка… С. 273. У Польскім каралеўстве гэты працэс пачаўся раней, у XV ст. Гл.: *Bobrzyński, Michał.* Historia karczmy. С. 43.

[284] Толькі пасля ўніі 1569 г. адбылося поўнае адмежаванне ўладданяў гаспадара ад дзяржаўных. Гл.: *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка… С. 164.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

нікоў. У той жа час да пашырэння п'янства прычыніліся не толькі манарх, яго намеснікі, прадстаўнікі мяшчан, габрэяў, але і землеўладальнікі ВКЛ. У пагоні за нажывай, дакладней, за правам прапінацыі, якое дзейнічала ў Кароне, шляхта імкнулася да аб'яднання з ёй, каб па прыкладу польскай шляхты мець права вольна вырабляць і прадаваць гарэлку, якая лёгка ўзбагачала, а ў выніку прапіла, можна сказаць, незалежнасць сваёй дзяржавы. Негатыўныя вынікі пашырэння піцейнага гандлю прадстаўнікі вышэйшых станаў стараліся ўскласці на габрэяў. Некаторыя меры ўлады па стрымліванні п'янства прымаліся, пераважна, для выгляду і мелі фармальны храктар.

Высновы

1. Мяшчане і габрэі вялі рознічны гандаль алкагольнымі напоямі, як правіла, мясцовай вытворчасці. Асноўнымі ўстановамі, дзе прадаваліся алкагольныя напоі, з'яўляліся корчмы. Сярод іх наведвальнікаў былі прадстаўнікі ўсіх станаў. Жанчыны ў склад аматараў налкагольных напояў не ўваходзілі[285]. Корчмы належалі вялікаму князю і вольным ад прыгону асобам. Гараджане, акрамя таго, прадавалі напоі ў шынках (корчмах у жылых дамах без заезду), піўных, піцейных дамах піўніцах (нежылых). Стацыянарны гандаль у гарадах пачынаўся з піцейных устаноў.

2. У адрозненні ад Польскага каралеўства, корчмы засноўваліся толькі вялікім князем або толькі з яго дазволу, паколькі яму належала мапольнае права на продаж, а пры Жыгімонце Аўгусце і на выраб гарэлкі. Абывацелі ВКЛ захоўвалі вельмі абмежаванае права на выраб піва і піўнога мёду для асабістага спажывання. Карчомны гандаль даваў значны прыбытак у дзяржаўны (земскі) і вялікакняжацкі (гаспадарскі) скарб і быў важнай часткай дзяржаўнай гаспадаркі ВКЛ. Аднак гандаль напоямі, а значыць і ўнутраны рознічны гандаль, не быў у тагачасных гаспадароў ВКЛ такім прыярытэтным, як знешні гандаль і земляробства.

3. У XVI ст. вылучалася пяць груп габрэяў, якія мелі справу з піцейным гандлем: 1) заможныя бралі гаспадарскія корчмы на водкуп разам з піцейным, мытным і іншымі зборамі; 2) менш заможныя арандавалі асобныя гаспадарскія корчмы ў намеснікаў вялікага князя або ў яго адкупнікоў; 3) у гарадах многія трымалі шынкі; 4) адзінкі арандавалі сельскія корчмы ў землеўладальнікаў, якія засноўвалі іх з ласкі вялікага князя; 5) некаторыя габрэі займаліся патаемным гандлем у "пакутных" корчмах.

4. Колькасць габрэяў сярод карчмароў узрастала. Аднак, можна з пэўнасцю сцвярджаць, што большасць корчмаў знаходзілася ў руках негабрэяў. Нават у такім

[285] Наведванне ў XVI ст. корчмаў жанчынамі і нават сем'ямі, як гэта сцвярджае Наталля Сліж, уяўляецца перабольшаным. Гл.: *Сліж, Наталля.* Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя. С. 57–60.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

габрэйскім горадзе як Пінск у 1560-х гг. габрэям належала толькі траціна корчмаў, хоць гэтую, дагаварную паміж імі і мяшчанамі, норму яны пачалі парушаць.

5. XVI стагоддзе дало першы значны вопыт ужывання гарэлкі ў ВКЛ. Яе першае ўпамінанне выяўлена ў дакуменце 1498 г., які адносіўся да Смаленска. Не выключана, што гарэлка была запазычана з Маскоўскага княства, якое мела сувязі з арабскім светам. Урбанізацыя выбівала людзей з традыцыйнага грамадства, таму п'янства пачыналася ў гарадах. Гэтаму спрыялі і шэраг іншых прычын: традыцыя разлічвацца за працу гарэлкай, бо не хапала звонкай манеты; войны, якія неслі гора і спусташэнні; п'янства сярод наёмнікаў; наяўнасць у гарадах вялікай колькасці алкагольных напояў і шынкоў. Аднак, у суверэнным ВКЛ п'янства не было так пашырана, як на Захадзе ў XVI ст. і ў Маскоўскай дзяржаве. Калі вялікі князь літоўскі кіраваўся у рэгуляванні продажу напояў законам, то маскоўскі цар Іван Грозны гвалтам насаджаў кабакі. Калі ў ВКЛ існавала свабода хатняга вырабу алкагалю на ўласныя патрэбы, то ў Маскоўскай дзяржаве набыццё алкаголю ў кабаках стала павіннасцю падатных саслоўяў[286]. Мясцовая шляхта, у адрозненні ад польскай, не мела права прапінацыі, а таму п'янства яшчэ не пашырылася на сялянства. Пераход да масавай вытворчасці алкагольных напояў у броварах адбыўся толькі ў канцы 1560-х гг.

6. Вядома, што ўжо Вітаўт Вялікі абкладваў гандаль у негаспадарскіх корчмах падаткам, які пазней атрымаў назву "капшчызна", а свае корчмы аддаваў у арэнду. Павялічэнне прыбыткаў ад гандлю напоямі адбывалася пры Жыгімонце Аўгусце, калі пачаўся іх масавы выраб і спажыванне, а вялікі князь пачаў аддаваць зборы ад піцейнага гандлю на водкуп. Велічыня вялікакняжацкага прыбытку ад гандлю алкаголем залежала ад колькасці корчмаў, іх размяшчэння, асартыменту прадаваемых карчомных напояў, велічыні гарадоў і адміністрацыйных адзінак, піцейны збор у якіх аддаваўся на водкуп.

7. Яшчэ не ўзнікла абвінавачванне габрэяў у спайванні хрысціян. Магчыма з-за відавочнасці таго, што карчомны гандаль быў выгадным найперш самаму гаспадару ВКЛ і яго намеснікам, ды і габрэі яшчэ складалі нязначную частку насельніцтва, каб істотна паціснуць хрысціянскіх гандляроў на рынку спажывання алкаголю. П'янства ў гарадах ВКЛ распаўсюдзілася да сярэдзіны XVI ст., калі габрэі яшчэ не мелі там перавагі ў гандлі спіртнымі напоямі. У сельскую мясцовасць габрэі перасяліліся для працы ў памешчыцкіх корчмах, але не ў такой меры, каб іх можна было вінаваціць ў спайванні сялян. Праўда, нельга зусім апраўдваць габрэяў у пашырэнні п'янства, паколькі іх удзел у развіцці гандлю алкаголем відавочны. Аднак, нельга абвінавачваць у гэтым толькі іх. У суверэнным ВКЛ рэй у піцейным гандлі вялі вялікія князі і іх адміністрацыя.

8. У XVI ст. напрацаваны ў піцейным гандлі капітал выкарыстоўваўся для эканамічнага развіцця гарадоў і памешчыцкіх гаспадарак, ажыўляў эканоміку

[286] *Прыжов, Иван*. История кабаков в России… С. 48–51, 67–68.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

ВКЛ. Аднак, уздым гандлю алкагольнымі напоямі і п'янства – выпадкова ці не – супаў са стратай суверэннасці гэтай дзяржавы.

9. На некаторыя пытанні дакументы выбранага перыяду яшчэ не даюць адказу, таму даследаванне карчомнага гандлю ў больш познія часы будзе працягнута.

Анатацыя: У артыкуле "Гандаль алкаголем у Вялікім Княстве Літоўскім і ўдзел у ім яўрэяў (канец XIV ст. – 1572 г.)" аўтар выкарыстаў шматлікія апублікаваныя крыніцы. Ён даследуе: зараджэнне вытворчасці алкагольных напіткаў, прававыя ўмовы для такога гандлю, яго падаткаабкладанне і прыбытковасць, дзейнасць устаноў гандлю алкаголем, канкурэнцыю паміж гандлярамі алкаголем, склад гандляроў алкаголем, ашырэнне п'янства. Аўтар высветліў, што колькасць яўрэйскіх устаноў гандлю алкаголем узрастала, аднак, большасць з іх знаходзілася ў руках хрысціян. Абвінавачванняў яўрэяў у культываванні п'янства сярод хрысціян яшчэ не было. Хоць праявы эканамічнага антысемітызму мелі месца.
Ключавыя словы: Вялікае Княства Літоўскае, Беларусь, гандаль, алкаголь, карчма, яўрэі, эканамічны антысемітызм

Drinking Trade of the Grand Duchy of Lithuania and the participation of Jews (End of XIV in. — 1572)

Abstract: The article "Trade in alcohol in the Grand Duchy of Lithuania and participation Jews in it (in the end of XIV – 1572)" the author used numerous published sources. He explores: the emergence of alcoholic beverages, legal conditions for such trade, taxation and its and profitability, activity alcohol trade institutions, competition between traders of alcohol, the composition of the merchants alcohol, extension of drunkenness. The author found that the number of Jewish institutions alcohol trade increased, but most of them were in the hands of Christians. Nonetheless, manifestations of economic antisemitism took place.
Keywords: Grand Duchy of Lithuania, Belarus, trade, alcohol, karchma (tavern), Jews, the economic antisemitism

Handel alkoholem w Wielkim Księstwie Litewskim i udział w nim Żydów (koniec XIV wieku – 1572 rok)

Streszczenie: W artykule przeanalizowano początek produkcji napojów alkoholowych, warunki prawne dla jego handlu, opodatkowanie i jego dochodowość, działalność instytucji nim handlujących, konkurencję pomiędzy handlarzami, skład handlarzy, rozpowszechnienie pijaństwa – na podstawie licznych źródeł piśmienniczych. Autor stwierdził, że liczba żydowskich instytucji handlu alkoholem wzrastała w tamtym czasie, jednak większość z nich znajdowała się w rękach chrześcijan. Oskarżenia Żydów o kultywowanie pijaństwa wśród chrześcijan jeszcze nie było, niemniej jednak miały miejsce przejawy antysemityzmu gospodarczego.
Słowa kluczowe: Wielkie Księstwo Litewskie, Białoruś, handel, alkohol, karczma, Żydzi, antysemityzm gospodarczy

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Wykaz źródeł i literatury

Źródła drukowane

Акты издаваемые виленскою комиссиею для разбора древних актов (АВАК). В 39 томах. Вильня, 1865–1915.

Беларускі архіў. Том трэці (XV–XVIII). Беларуская акадэмія навук. Менск: Друкарня Беларускай Акадэміі Навук 1930 (на правах рукапісу).

Литвин, М. [О нравах татар, литовцев и москвитян]. Отрывки 1–10./ Пер. К. Мельник. Предисл. и ред. В. Б. Антоновича // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Вып. I. Киев, 1890; *Литвин, Михалон.* О нравах татар, литовцев и москвитян. М: МГУ. 1994.

Lietuvos Metrika. Vilnius, 1995–2014.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2000–2015.

Регесты и надписи. Свод материалов для истории евреев в России (80 г. – 1800 г.). Т. I (до 1670 г.). СПб., 1899; Регесты и надписи. Свод материалов для истории евреев в России (80 г. – 1800 г.). Т. II. (1671–1739 г.). СПб., 1910.

Русская историческая библиотека. Т. XX. Литовская Метрика. т. 1. Книги судных дел. СПб., 1903. Русская историческая библиотека. Т. XXVII. Литовская Метрика. Отдел 1. Часть 1: Книги записей. т. 1. СПб., 1910. Русская историческая библиотека. Т. XXX. Литовская метрика. Отделы первый-второй. Ч. 3: Книги публичных дел. т. 1. Юрьев, 1914.

Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т. I. Документы и регесты к истории литовских евреев (1388–1550). Собрал и издал С.А.Бершадский. СПб., 1882; Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т. II. Документы и регесты к истории литовских евреев (1550–1569). Собрал и издал С.А.Бершадский. СПб., 1882.

Статут Великого княства Литовского 1529 г. Минск: Издательство Академии наук БССР, 1560; Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. — Мінск, 2003.

Materiały internetowe

Воложанский, Владимир. Белорусская корчма, или 5 фактов об истории придорожного сервиса. Режим доступа: http://mogu.by/news/news/belorusskaia_korchma__ili_5_faktov_ob_istorii_pridorozhnogo_servisa.html

История Гродненской еврейской общины в датах. Рэжым доступа: http://www.bhsinagoga.by/index.php/menu-combos/ob-obshchine/92–istoriya-grodnenskoj-evrejskoj-obshchiny-v-datakh

Kobyliński, Maciej. Karczmy w dawnej Polsce. Рэжым доступа: http://www.polinow.pl/karczma-karczmy_w_dawnej_polsce

Кленов, Николай. Величие и падение Смоленска. [Очерк истории этнического самосознания Смоленской земли в контексте ее политической истории] Рэжым доступа: http://actualhistory.ru/smolensk_rise_and_fall_2

Пазднякоў, Валерый. Капшчына // Электронная энцыклапедыя "Вялікае Княства Літоўскае". Рэжым доступу: http://vkl.by/articles/1089

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

Radziewicz, *Joanna*. Rola karczmy w życiu dawnej wsi polskiej. Рэжым доступа: http://rme.cbr.net.pl/index.php/archiwum-rme/377-marzec-kwiecie-nr-54/kultura-i-tradycje-ludowe40-7681/339-rola-karczmy-w-yciu-dawnej-wsi-polskiej

Уваров, И.Ю. Город Слоним в XVI веке. Режим доступа: http://www.slonim.org/modules/sections/index.php?op=printpage&artid=22

Фридман, Александр. Евреи Беларуси в XV столетии. Рэжым доступа: http://www.beljews.info/ru/article_15th_century.php

Literatura

1. Monografie

Бершадский, С.А. Литовские евреи: история их юридического и общественного положения в Литве. От Витовта до Люблинской унии, 1388–1569 гг. СПБ, 1883.

Бабкова, Вольга. …І цуды і страхі: эсэ па гісторыі штодзённасці Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стагоддзяў / В. У. Бабкова. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010.

Бродэль, Фернан. Материальная цивидизация, экономика и капітализм, XV–XVIII вв. Том I. Структкры повседневности: возможное и невозможное. Ред. Ю.Н.Афанасьев. Москва 2006. С. 214.

Гардзееў, Юры. Магдэбургская Гародня. Гародня – Wrocław, 208. С. 306.

Госцеў, А.П., Швед, В.В. Кронон. Летопись города над Неманом. Гродно, 1993

Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства літоўскага пры Ягелонах. Магістарская дысертацыя. Кіеў, 1901.

Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М.В. Доўнар-Запольскі ; падрыхт.: А. І. Груша, Р. А. Аляхновіч. Мінск: Беларуская навука, 2009.

Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси. Краткий научно-популярный очерк. Минск 1997.

Копысский, З.Ю. Социально-экономическое развитие гродов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Мн., 1975.

Кухмістр, Верашчака (сапраўдн. Белы, Алесь). Сакатала бочачка: праўдзівая гісторыя нашых напояў Мінск, 2017 – 208 с.: іл.

Лаппо, И.И. Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-Русский повет и его сеймики. Юрьев, 1911.

Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. Издание 2–е. Москва 1915.

Пичета, В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1958.

Прыжов, Иван. История кабаков в России в связи с историей русского народа. Издание М. О. Вольфа, 1868 (перавыдадзена ў 2009 г.).

Baronowski, B. Polska karczma: restauracja, kawiarnia. Wrocław: Zakł. Nar. im. Ossolińskich, 1979.

Bobrzyński, Michał. Prawo propinacyi w dawnej Polsce. Kraków: 1888.

Bobrzyński, Michał. Historia karczmy. O prawie propinacji w dawnej Polsce. Kraków: Cztery Strony 2016.

Burszta, Józef. "Wies i karcma: Rola karczmy w zyciu wsi panszczyznianej". Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1950.

Chrzanowski, T. Karczmy i zajazdy polskie. Warszawa: Arkady, 1958.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 17/11/2026 13:02:29

2. Broszury

Вікол, Л. Ф. Фарміраванне і развіццё грамадскага харчавання ў Беларусі ў XVI – пачатку XX стст. Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. Мінск, 2016.

3. Artykuły naukowe

Абрамчик, Лилия Я. Становление налогов и их развитие на территории Беларуси (до января 1919 года) // Miscellanea historico-iuridica tom XI ROK 2012. С. 103.

Бабкова, Вольга. Карчма // Наша ніва. № 32 (93) 17 лістапада 1997 г.;

Бабкова, Вольга. Карчма (паводле актавых кніг Менскага і Слонімскага судоў канца XVI – пачатку XVII ст. // Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя. Культура. Рэлігія. Палітыка. Авантура. Героіка. Успамін / [уклад. А. Дзярновіч]. – Мінск, 2007.

Бершадский, С.А. Аврам Езофович Ребичкович // Киевская старина №12, 1888.

Доўнар-Запольскі, М. Сацыяльна-эканамічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI–XVII сталецьцях // Гістарычна-археолёгічны зборнік. № 1. Менск: Інбелкульт, 1927. С. 42.

Мянжынскі В.С., Несцяровіч Ю. В. Прывілеі на корчмы з кніг Метрыкі ВКЛ 43 // Белорусский археографический ежегодник. 2003. Вып. 4.

Прыжов, И. Корчма. Исторический очерк // Русский архив. М.,1866. Вып. 7. С. 1059.

Рогач, Л. Ф. Яўрэй-карчмар і карчма ва ўспрыняцці грамадства XVI–XIX стст. на падсвядомым узроўні / Л. Ф. Рогач // Рэха мінуўшчыны: зб. навук. работ студ. навук. таварыства факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ імя Я. Купалы / рэдкал.: А. С. Горны, А. М. Загідулін. – Гродна: ГрГУ, 2010.

Сергачев, С. А. Архитектура корчмы в Белоруссии // Архитектурное наследство. Вып. 33. М., 1985. С. 148–156.

Сліж, Наталля. Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў ВКЛ XVI стагоддзя // ARCHE. 2012. № 3. С. 57–60.

Швед, Вячаслаў. Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) // Nowe wyzwaniagospodarki turystycznej na poziomie lokalnym, regionalnym I miedzynarodowym. – Bialystok: Wydawnicza Politechniki Bialostockiej, 2011.

4. Opracowania encyklopedyczne

Gloger, Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana T.3. Warszawa: Wiedza Powszechna, 1978.